

Слабы пол даўно не слабы?

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень
20 КАНАЛАЎ



Мы, бацькі, выхоўваем дзяцей, а дзеці выхоўваюць нас

СТАР. 6



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 СТУДЗЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 8 (27618) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ ЧАКАЕ РАПТОЎНАЯ ПРАВЕРКА

**У Беларусі будзе праведзена раптоўная праверка Узброеных Сіл. Такую задачу паставіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 студзеня, прымаючы з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандра Мяжуева, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Мы ні ад каго не ўтойвалі, што нам давядзецца сур'ёзна праверыць нашы Узброеныя Сілы. Нават нягледзячы на тое, што (трэба аддаць належнае, і я ўжо аб гэтым гаварыў) за мінулы год Узброеныя Сілы былі на добрым узроўні і нямала зроблена міністрам. Але тым не менш недатыкальных у краіне няма. Мы павінны, асабліва людзей у пагонах, правяраць на прадмет гатоўнасці дзейнічаць у любой сітуацыі ў любы час», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што даручаў прапрацаваць прапановы па раптоўнай праверцы Узброеных Сіл і асобных часцей. «Гэта не павінна быць фармальным, гэта павінна быць вельмі сур'ёзна. Мы не для паказухі гэта робім, ды і грошай у нас няма, каб займацца паказухай», — адзначыў Прэзідэнт.

«Таму, зыходзячы з гэтых крытэрыяў, я хацеў бы пачуць, як і што мы будзем рабіць. Зразумела, гэта размова павінна быць закрытай, таму што гэта раптоўная праверка і ніхто ва Узброеных Сілах аб гэтым ведаць не павінен. Усе матэрыялы і рашэнні, якія будуць прыняты да праверкі, павінны мець абсалютна закрыты характар», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПЛАТФОРМА БУДЗЕ СТВОРАНА ДА КАНЦА 2015 ГОДА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 16 студзеня правёў рабочую сустрэчу з начальнікам Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Беларусі Сяргеем Шпегуном. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні стварэння рэспубліканскай інфармацыйнай платформы, якая ўключае ў сябе апорную сетку перадачы даных і рэспубліканскі цэнтр апрацоўкі даных.

Як далажыў начальнік ААЦ, апорная сетка цяпер ужо манціруецца, завяршыць яе будаўніцтва плануецца ў снежні 2014 года. Стварэнне рэспубліканскага цэнтра апрацоўкі даных плануецца завяршыць да канца 2015 года. Работа вядзецца ў рамках інвестпраекта агульным аб'ёмам каля $300 млн.

Платформа будуецца на аснове сучасных тэхналогій і будзе адпавядаць усім сусветным стандартам.

Таксама абмяркоўвалася дзейнасць Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг, задача якога ў забеспячэнні электроннага міжведамаснага дакументаабароту.

Асобна кіраўнік дзяржавы закрануў тэму аказання Беларуссю паслуг пропуску міжнароднага трафіку. «За гэта мы атрымліваем пэўныя грошы, і грошы нядрэнныя, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але спецыялісты ўсё часцей падкрэсліваюць, што мы нямала страчваем з-за шэрага трафіку. Вы прапануеце пэўную сістэму кантролю за ім, але пры гэтым пераконваеце мяне ў тым, што гэта не прынясе нейкай шкоды нашай краіне, і мы, наадварот, павялічым паступленні ў бюджэт. Вядома, змагацца супраць гэтага трафіку адназначна трэба, і паступленні ў бюджэт, зразумела, павінны павялічвацца. Хачу, каб вы мяне праінфармавалі ў гэтай частцы».

Па выніках рабочай сустрэчы Прэзідэнт паставіў задачу і ў далейшым развіваць абазначаныя напрамкі, павышаць іх якасць, каб Беларусь адпавядала сучасным патрабаванням у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

## МАШТАБНЫЯ ПРАЕКТЫ З СУСВЕТНЫМ БАНКАМ

**Беларусі і Сусветнаму банку трэба было б пашырыць супрацоўніцтва ў галіне дарожнага будаўніцтва. Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з дэлегацыяй Сусветнага банка, перадае БЕЛТА.**

«Часткова асобныя праекты ўжо ў рабоце, але лічым, што гэтага недастаткова. Можна было б узяць усю праграму дарожнага будаўніцтва і развіццё транспартнай інфраструктуры пад эгіду Сусветнага банка, каб рабіць маштабныя праекты», — сказаў прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што работа Беларусі з групай Сусветнага банка развіваецца даволі дынамічна. «У нас з'явіліся новыя праекты і новыя фінансавыя магчымасці ў сувязі з прыняццем стратэгіі банка», — звярнуў увагу кіраўнік урада. Ён паведаміў, што падчас сустрэчы плануецца абмеркаваць шэраг праектаў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць.

«Нам бачыцца мэтазгодным далейшае развіццё дамоўленасцяў, якія ёсць у прадстаўніцтваў банка з рэгіёнамі і Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі, па інфраструктурных аб'ектах у галіне водазабеспячэння і водаадвядзення, а таксама разгляд пытанняў, звязаных з ліквідацыяй наступстваў аварыі на Чарнобыльскай станцыі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

## З НАВАСЕЛЛЕМ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Новы год для 25-гадовага жыхара вёскі Баравое Лельчыцкага раёна Вадзіма ПАРАДЗІНСКАГА пачынаецца з прыемных клопатаў — ён толькі што атрымаў ключы ад новага дома і пачынае перасяленне. Вадзім працуе галоўным энергетыкам сельскагаспадарчага прадпрыемства «Зорка Палесся» і пра тое, што гаспадарка будуе для яго дом, даведаўся яшчэ год таму. Ведае таксама, што будаўніцтва жылля ў Баравым вядзе Лельчыцкая ПМК-103. Значыць, дом будзе цёплы і ўтульны. А праз некалькі месяцаў у маладога гаспадара плануецца вяселле.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай КРЫЖЭВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення антыманапольнай палітыкі Мінгарвыканкама:**

***«Правядзенне чэмпіянату свету па хакеі 2014 года не выкліча скачкападобнага росту цэн у Мінску. Мінгарвыканкам вывучыў вопыт правядзення падобных мерапрыемстваў у суседніх краінах. Былі пэўныя моманты ва Украіне падчас Еўра-2012, у іншых краінах, мы гэта вывучылі і зрабілі некаторыя папераджальныя захады. Паміж органамі дзяржаўнай улады і прадпрыемствамі, якія будуць аказваць паслугі грамадскага харчавання і гасцінічныя паслугі падчас чэмпіянату, заключаюцца пагадненні, у якіх вызначаецца парог росту цэн. Ёсць разуменне гэтага пытання як у бізнесу, так і ва ўлады, усё будзе цывілізавана».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.01.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9560,00 | ■ |
| Еўра | 13010,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1147,66 | ▼ |

■ Жыллёвае будаўніцтва

## БЕЗ БОЯЗІ І АЗІРАННЯЎ

**У нашай краіне прыняты дакумент аб удасканаленні будаўнічай дзейнасці, дзе галоўным прыярытэтам стане абарона правоў грамадзян пры будаўніцтве жылля. Адпаведны Указ Прэзідэнта Беларусі № 26 падпісаны 14 студзеня, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Гэтым дакументам унесены змяненні ва Указ Прэзідэнта ад 6 чэрвеня 2013 года № 263 «Аб долевым будаўніцтве аб'ектаў у Рэспубліцы Беларусь», дзе зацверджана адзіная форма тыпавога дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва. Такі тыпавы дагавор у абавязковым парадку будзе заключацца паміж грамадзянамі і забудоўшчыкамі пры долевым будаўніцтве жылля як з аказаннем дзяржаўнай падтрымкі, так і пры камерцыйным будаўніцтве.

Цяпер прыцягненне сродкаў дольшчыкаў дапускаецца толькі пры ўзвядзенні аб'екта будаўніцтва альбо яго часткі за кошт уласных сродкаў забудоўшчыка. Пры гэтым сума падобных сродкаў павінна складаць не менш за 15% ад кошту аб'екта. Таксама ўказам прадугледжана ўзмацненне адміністрацыйнай адказнасці службовых асоб за незабеспячэнне выканання абавязкаў, парушэнне тэрмінаў і неналежнае выкананне работ у будаўнічай дзейнасці. На перыяд дзеяння гарантыйнага тэрміну эксплуатацыі аб'екта падрадчык абавязаны прадаставіць заказчыку (забудоўшчыку) забеспячэнне выканання сваіх абавязацельстваў па ліквідацыі работ неналежнай якасці.

Падраздзяленням Мінбудархітэктуры даручана зацвердзіць альбом схем інвестыцыйнага працэсу, які вызначае паслядоўнасць дзеянняў пры ажыццяўленні інвестыцыйнага праекта ў будаўніцтве, і вызначаныя заканадаўствам патрабаванні (умовы, адміністрацыйныя працэдуры), выкананне якіх абавязкова пры праходжанні гэтых стадый.

СТАР. 2

## ГРОДНА ПРЫМАЕ ЭСТАФЕТУ КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСІ

Гродна 2014 культурная сталіца Беларусі

**З гэтай нагоды 18 студзеня ў абласным драматычным тэатры адбудзецца святочны канцэрт з удзелам вядомых артыстаў — ураджэнцаў горада над Нёманам Сашы Нэма, Галіны Шышковай, Валерыя Скаражонка, творчых калектываў нацыянальных аб'яднанняў, дзіцячых ансамбляў, групы сучаснай харэаграфіі «ТАД», Гродзенскай капэлы, музычнага тэатра «Рада», ансамбля песні, музыкі і танца «Белыя росы».**

Святочная імпрэза распачнецца з тэатралізаванага прадстаўлення, дзе артысты будуць у вобразе гістарычных асоб мінуўшчыны. А знакавыя факты сучаснай гісторыі горада будуць пазначацца ў спецыяльна выробленай вялікай кнізе, якую ўрачыста прэзентуюць у гэты дзень на сцэне драмтэатра. Акрамя таго, адбудуцца майстар-класы па розных відах рамёстваў і народнай творчасці, выставы мастацкіх работ гродзенскіх аўтараў, а таксама макетаў будынкаў — помнікаў гістарычнай спадчыны.

Дарэчы, ужо распрацаваны лагатып культурнай сталіцы — 2014, які ўяўляе сабой выяву Гродзенскага абласнога драмтэатра, упрыгожаную беларускім арнаментам.

Лагатып будзе выкарыстоўвацца пры вырабе сувенірнай і рэкламнай прадукцыі, размяшчацца ў грамадскім транспарце і розных установах. Будуць таксама ўстаноўлены білборды з партрэтамі знакамітых гарадзенцаў розных эпох, турыстычныя маршрутызатары, памятныя інфармацыйныя таблічкі. Неўзабаве ў грамадскім транспарце жыхары і госці горада змогуць пачуць вершы вядомых гродзенскіх паэтаў.

Цікавыя навінкі рыхтуюцца і да фіналу традыцыйнага, ужо X рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які адбудзецца ў Гродне 6-7 чэрвеня. Напрыклад, упершыню ў фестывальным фармаце мяркуецца правесці конкурс прыгажосці сярод прадстаўніц нацыянальных аб'яднанняў, а ў яго рамках — прэзентацыі нацыянальных касцюмаў. У парку імя Жана Эмануэля Жылібера будуць прадстаўлены работы ўдзельнікаў творчага пленэру «Гродна вачамі мастакоў розных нацыянальнасцяў». На фестываль запрошаны прадстаўнікі беларускіх нацыянальных аб'яднанняў з Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Надвор'е

## НА ВАДОХРЫШЧА МАРОЗ ВУШЫ «КУСАЕ»

**А ўначы на аўторак — да мінус 25.**

Сёння тэрыторыя Беларусі будзе пераважна пад уплывам халодных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з поўначы Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Пры гэтым атмасферныя франты з боку Польшчы прынясуць у паўднёва-заходнія рэгіёны краіны сур'ёзны снег. У Брэсцкай вобласці мокры снег і слабы галалёд, на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 1 градуса па паўднёвым захадзе да мінус 11 градусаў на поўначы краіны. Прагназуецца, што ў суботу снегапады «накрыюць» ужо большую частку Беларусі, месцамі слабая мяцеліца. Тэмпература паветра на працягу сутак мінус 8-14 градусаў, аднак па паўднёвым захадзе толькі 2-7 марозу. Уначы на поўначы краіны пахаладае да мінус 15-19 градусаў.

На свята 19 студзеня нас чакаюць калядныя маразы. У большасці раёнаў без істотных ападкаў, толькі месцамі невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы мінус 13-18 градусаў, пры праясненнях да 23 марозу, удзень — 9-14 градусаў ніжэй за нуль. Па паўднёвым захадзе ўсталюецца больш мяккае надвор'е, калі ўначы мінус 7-12, а ўдзень — 6-8 градусаў ніжэй за нуль.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КІТАЙ СТВАРЫЎ ГІПЕРГУКАВУЮ РАКЕТУ, ЗДОЛЬНУЮ ПРАРВАЦЬ АМЕРЫКАНСКУЮ СІСТЭМУ ПРА



Кітай упершыню выпрабаваў гіпергукавую ракету, стаўшы трэцяй краінай пасля Расіі і ЗША, што прасунулася настолькі далёка ў стварэнні гэтага тыпу ўзбраенняў. Як перадае ВВС, у кароткім паведамленні міністэрства абароны КНР гаворыцца аб навуковым характары выпрабаванняў і іх паспяховым выніку. Першым пра выпрабаванне ракеты паведаміла 13 студзеня амерыканскае выданне Washington Free Beacon. Паводле яго звестак, ракета была запушчана 9 студзеня. У міністэрстве абароны ЗША пацвердзілі, што валодаюць інфармацыяй пра гэта. Згодна з непацверджанай інфармацыяй, якая з'явілася ў інтэрнэце, хуткасць выпрабаванай КНР ракеты нібыта ў 10 разоў перавышае хуткасць гуку. Выданне адзначае, што такая ракета можа прарваць амерыканскую сістэму супрацьракетнай абароны.

### ЗАФІКСАВАНЫЯ СМЯРОТНЫЯ ВЫПАДКІ СВІНОГА ГРЫПУ

У паўночнай частцы Іспаніі двое мужчын 62 і 76 гадоў памерлі ад свінога грыпу. У цэлым з прычыны ўспышкі віруса H1N1 у бальніцы Арагона трапілі 43 чалавекі, распавядае The Straits Times. 18 чалавек знаходзяцца ў інтэнсіўнай тэрапіі.

### ВА УКРАІНЕ БУДУЦЬ АРЫШТОЎВАЦЬ ПРЫХІЛЬНІКАЎ ДЫВІЗІІ СС «ГАЛІЧЧЫНА»?

Вярхоўная Рада Украіны ўвяла крымінальную адказнасць за публічнае адмаўленне ці апраўданне злачынстваў фашызму. На пасяджэнні 16 студзеня дэпутаты прынялі за аснову і ў цэлым законапраект, які ўносіць адпаведныя змены ў Крымінальны кодэкс. Пра гэта гаворыцца на сайце парламента. За дакумент прагаласавалі 235 дэпутатаў пры неабходным мінімуме ў 226 галасоў. Законапраект камуністаў Пятра Сіманенкі і Ігара Аляксеева ўводзіць у КК новы артыкул 436-1 (артыкул 436 — «Прапаганда вайны»), які абвяшчае: «Публічнае адмаўленне ці апраўданне злачынстваў фашызму супраць чалавечнасці, учыненых у гады Другой сусветнай вайны, у прыватнасці, злачынстваў, учыненых арганізацыяй «Вафен-СС», падначаленымі ёй структурамі... караецца штрафам ад 500 да 1000 неабкладаемых мінімумаў даходаў грамадзян ці абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, ці пазбаўленнем волі на той жа тэрмін».

ISSN 1990 - 763X

14008

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГІПЕРТОНІКАМ ТРЭБА БЫЦЬ АСЦЯРОЖНЫМІ З ЗЯЛЁНЫМ ЧАЕМ



Зялёны чай здольны аслабіць эфект лекаў, якія рэгулююць ціск, папярэджваюць медыкі. Японскія спецыялісты высветлілі, што чай блакіруе клетачныя перадатчыкі, якія размяшчаюцца ў кішэчніку і звычайна дапамагаюць клеткам цела паглынаць бэта-блакатары, перадае ВВС. У прыватнасці, яны праверылі, як чай уздзейнічае на Надалол. Навукоўцы і раней папярэджвалі пра тое, што некаторыя напоі ўплываюць на лекі. У прыватнасці, гэта тычыцца пладовых сокаў, уключаючы сок грэйпфрута. Не выключана, што ў хуткім часе ў анатацыі да бэта-блакатараў з'явіцца адпаведнае папярэджанне.

КОРАТКА

Кошт білетаў на цягнікі зносінамі з Расіяй часова зніжаны ў сярэднім на 9%. У прыватнасці, кошт праезду ў скорым поездзе Мінск—Масква і Мінск—Санкт-Пецярбург у купэйным вагоне знізіцца амаль на Br120 тыс., у плацкартным — больш чым на Br60 тыс.

Устаноўлены новыя гранічныя максімальныя тарыфы на паслугі па прамянёвай, ультрагукавой, функцыянальнай і эндаскапічнай дыягностыцы. Напрыклад, кошт рэнтгеналагічных даследаванняў, якія ўжываюцца ва ўралогіі і гінекалогіі, складзе ад Br26 тыс. да Br183 тыс. (раней — ад 22,2 тыс. да 159,3 тыс.).

У Мінску ў Нацыянальным мастацкім музеі ўпершыню прадставілі работы бяздомнага гомельскага мастака Валерыя Ляшкевіча.

Грузавы аўтамабіль МАЗ згарэў на аўтазапраўцы каля вёскі Палыкавічы ў Магілёўскім раёне. Кіроўца атрымаў апёкі і шпіталізаваны.

## З ЯКОГА ЎЗРОСТУ ДЗЕЦЯМ МОЖНА ДАЗВАЛЯЦЬ КАРЫСТАЦЦА ІНТЭРНЭТАМ?



**Ірына ЕМЕЛЬЯНОВІЧ, маркетолаг, маці дваіх дзяцей, в. Дзятлавічы Лунінецкага раёна:**

— Мой старэйшы сын, якому зараз тры гады, можна сказаць, ужо карыстаецца інтэрнэтам. Звычайна я знаходжу для яго ў сеціве нейкія мультфільмы, уключаю іх, і на гэтым мая «місія» заканчваецца, бо сын умее самастойна паставіць відэа на паўзу, «адматаць» наперад, калі патрэбна. Але я заўжды кантралюю, што дзіця робіць за камп'ютарам.

А вось дазваляць карыстацца інтэрнэтам без строгага кантролю дарослых, на мой погляд, можна з класа восьмага. Тады «сусветная павуціна» можа шмат дапамагчы ў пытаннях вучобы, ды і стасункі з аднагодкамі зараз у падлеткаў не абыходзяцца без віртуальных зносін.



**Андрэй АНАНЧЫКАЎ, аператар паста кіравання 320-га стану гарачай пракаткі сортапракатнага цэха Беларускага металургічнага завода, г. Жлобін:**

— Мне было, мабыць, гадоў шаснаццаць, калі дома з'явіўся інтэрнэт. Але істотна на маё дзяцінства ён не паспеў паўплываць: я праводзіў шмат часу ў кампаніі сяброў, гуляў у футбол і ўвогуле жыў поўным жыццём. Сённяшнія дзеці знаёмяцца з «сусветнай павуцінай» ледзь не з першых гадоў жыцця, але я не лічу, што ім патрэбна гэта катэгарычна забараняць і дазваляць карыстацца інтэрнэтам з пэўнага ўзросту. Нейкія дрэнныя наступствы ад карыстання сецівам (напрыклад, залежнасць ад яго ці агрэсія), мабыць, бяруць пачатак ад агульнай атмасферы ў сям'і. Калі дзіця не адчувае адзіноты, калі бацькі ім займаюцца і выхоўваюць цікавасць да спорту ці іншых карысных захапленняў, то ў яго не будзе неабходнасці засяроджвацца толькі на віртуальным жыцці.



**Іна ЛІТВІНОВІЧ, студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, г. Мінск:**

— Думаю, найлепшы ўзрост, калі можна дазволіць карыстацца інтэрнэтам, — 14-15 гадоў. У гэты перыяд падлетка цікавіць розная інфармацыя, і ў той жа час ён ужо разумее, што прыстойна, а што не вельмі, што дазволена, а што недапушчальна ў інтэрнэт-прасторы. Падобны падыход засцеражэ ад многіх праблем. Я пазнаёмілася з інтэрнэтам прыкладна ў такім узросце. Памятаю, што найбольш часта туды заходзіла падчас падрыхтоўкі да школьных заняткаў, для таго, каб знайсці дадатковую інфармацыю. У сацыяльнай сетцы я зарэгістравалася толькі ў 16 гадоў. А сёння нават 10-гадовыя дзеці там «акопваюцца» і вольна сябе адчуваюць.

**Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# ДЗЯРЖАЎНЫХ УЗНАГАРОД УДАСТОЕНЫ ХАКЕІСТЫ І ТРЭНЕРЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўдастоіў дзяржаўных узнагарод хакеістаў і трэнераў за значны асабісты ўклад у развіццё спартыўнай сферы краіны, дасягненне высокіх спартыўных вынікаў, актыўнасць у грамадскім жыцці. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

У прыватнасці, медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны галоўны трэнер і спартсмен-інструктар ААТ «Хакейны клуб «Нёман» Алег Малашкевіч і Вячаслаў Лісічкін, старшы трэнер Бабруйскага філіяла «Дынама-Шыннік» ЗАТ «Хакейны клуб «Дынама-Мінск» Аляксандр Макрыцкі, трэнер хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск» Уладзімір Меленчук, спартсмен-інструктар хакейнага клуба «Металург-Жлобін» Аляксей Плотнікаў, спартсмен-інструктар хакейнага клуба «Гомель» Сяргей Стась, член каманды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па хакеі Сяргей Шабанаў.

Ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоена спартыўнаму дырэктару хакейнага клуба «Шахцёр» Аляксандру Аляксееву, трэнеру-выкладчыку спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву № 5 Яўгену Летаву, трэнеру хакейнага клуба «Шахцёр» Уладзіміру Свіце, спартсмену-інструктару хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск» Максіму Слышу.

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за высокія спартыўныя дасягненні і значны асабісты ўклад у развіццё беларускага спорту аб'яўлена трэнеру дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы «Дынама» па хакеі з шайбай Андрэю Кавалёву, спартсмену-інструктуру хакейнага клуба «Металург-Жлобін» Аляксандру Радзінскаму, члену каманды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па хакеі Аляксею Цітаўцу.

# ПАЧЫНАЦЬ З СЯБЕ

**Прыярытэтным кірункам ідэалагічнай работы ў сучасных умовах быў прысвечаны семінар ідэолагаў Гомельшчыны, у якім узяў удзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў.**

Ён падрабязна пазнаёміўся з тымі моладзевымі ініцыятывамі, якія знайшлі пачатак і ўвасабленне ў вобласці. Дарэчы, студэнты і школьнікі дзяліліся сваімі напрацоўкамі ў розных галінах, прадстаўлялі свае навуковыя і грамадскія праекты. Студэнты імкнуцца знаходзіць усё новае і новае, яны разумеюць, што адукаванаму чалавеку лягчэй знайсці сябе ў жыцці, адзначыў Аляксандр Радзькоў:

— Вельмі цікавыя ідэі прадстаўлены ў межах праекта «100 ідэй для Беларусі». Маладыя людзі, напрыклад, заклапочаны не толькі тым, як збіраць смецце, сістэматызаваць яго і ўтылізаваць, але і як пераканаць іншых людзей, што гэта трэба рабіць у маштабе ўсёй краіны. Інакш мы страчваем вялікія грошы. Не менш важныя і іншыя напрамкі, такія, як патрыятычнае выхаванне моладзі. Гэта — сувязная нітка паміж пакаленнямі, нам гэтага сёння вельмі не хапае. Шмат што страчана за мінулыя гады, але ж нам, беларусам, хочацца ведаць пра свае карані, пра свой радавод, пра сваіх продкаў. Размова зайшла і пра дэбюракратызацыю, звязаную ў тым ліку са скарачэннем на трэць дзяржаўнага апарату.

— Мы адразу адчулі, што яшчэ трэба добра асэнсаваць функцыянальныя абавязкі кожнага. У нашым менталітэце ёсць адмоўная рыса — перакладаць адказнасць на вышэйшую па пасадзе асобу, а трэба браць адказнасць на сябе. Калі мы прадумаем гэтую ступень адказнасці, будзе менш папер і менш часу спатрэбіцца на рэалізацыю рашэнняў. Жыццё будзе больш эфектыўным.

Выбары любога маштабу, у тым ліку ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, — гэта заўсёды момант ісціны, і ў такой буйной палітычнай акцыі павінны быць задзейнічаны ўсе без выключэння, — адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, старшыня РГА «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў:

— Людзі павінны быць актыўнымі, таму што вырашаецца важная дзяржаўная задача: вызначаецца заканадаўчае і адміністрацыйнае кіраўніцтва рэгіёна, краіны. Несумненна, што ўсе, хто шануюць свае сям'ю, краіну, разумеюць, што ад іх актыўнасці залежаць дастатак і перспектывы развіцця кожнага.

Актыўны ўдзел у выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў прыме і «Белая Русь». Аляксандр Радзькоў выказаў пажаданне, каб людзі, якія прадстаўляюць грамадскую арганізацыю, былі аўтарытэтнымі, мудрымі, з пэўным досведам ці з перспектывай. У гэты ж дзень на Гомельскі хімічным заводзе адбылося ўрачыстае ўступленне ў шэрагі аб'яднання «Белая Русь» 10 працаўнікоў прадпрыемства.



Падчас семінара.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Сяргей МАСКЕВІЧ:

# «АД СВАІХ АБЯЦАННЯЎ МЫ НЕ АДМАЎЛЯЕМСЯ»

**Заработная плата педагогаў будзе павышацца пры з'яўленні рэальных магчымасцяў у эканоміцы краіны. Пра гэта прадстаўнікам СМІ заявіў міністр адукацыі нашай краіны Сяргей Маскевіч.**

Журналісты нагадалі кіраўніку адукацыйнай галіны пра абяцанне павысіць у новым годзе заробкі работнікам сістэмы дашкольнай адукацыі. Менавіта ў дашкольнай адукацыі склалася апошнім часам самая напружаная кадравая сітуацыя, у тым ліку і з-за надзвычай нізкіх заробкаў. З 1 ліпеня 2013 года тарыфныя стаўкі выхавальнікаў былі павышаны на 25%, а памочнікаў выхавальнікаў — на 10%, што прывяло да росту рэальных заробкаў выхавальнікаў у сярэднім толькі на 12-13% (да 2,6-2,7 млн рублёў), а памочнікаў выхавальнікаў — на 7% (да 1,5 млн рублёў). Такім чынам, заработная плата выхавальнікаў і памочнікаў выхавальнікаў па-ранейшаму застаецца зусім невысокай, а па астатніх катэгорыях работнікаў дашкольных устаноў яна ўвогуле не пераглядалася.

— Ад абяцанняў і рашэнняў, што прымаліся, мы не адыходзілі, — запэўніў журналістаў Сяргей Маскевіч. — Аператыўна, пасля з'яўлення Закона аб бюджэце на 2014 год, пачаў рыхтавацца цэлы пакет нарматыўна-прававых актаў, якія будуць стымуляваць і рэгуляваць пытанні павышэння заработнай платы ў сістэме адукацыі. Трэба канчаткова ўзважыць усе рэсурсы, якія мы маем на гэты год. І я ўпэўнены, што ўсе абяцанні будуць выкананы.

Нагадаем, што напрыканцы снежня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі накіраваў у Савет Міністраў афіцыйны зварот з просьбай звярнуць увагу на трывожную сітуацыю, якая склалася ў адукацыйнай галіне. Павышэнне з 1 верасня 2013 года тарыфных ставак педагагічным работнікам на 25%, якое адбылося адначасова з павелічэннем нормаў педагагічнай нагрузкі, фактычна толькі кампенсавала рост педагагічнай нагрузкі.

Суадносіны ўзроўню сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў сістэмы адукацыі да ўзроўню заробкаў у прамысловасці склалі ў Беларусі за студзень—кастрычнік 2013 года 60,1%.

Сёння ўсіх педагогаў цікавіць, ці будзе перагледжаны памер надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі і ці стане розніца ў надбаўках за першую, другую і вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю больш істотнай, каб матываваць педагогаў да прафесійнага развіцця і, адпаведна, якасці іх работы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЗРЫЎ ТЭРМІНАЎ МАНТАЖУ АБСТАЛЯВАННЯ НА ДОБРУШСКАЙ ПАПЯРОВАЙ ФАБРЫЦЫ ПРЫВЁЎ ДА ІСТОТНЫХ СТРАТ

**Зрыў тэрмінаў мантажу новай папераробнай машыны на Добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы» прывёў да істотных страт для прадпрыемства як у недаатрыманым прыбытку, так і ў аб'ёмах выпуску прадукцыі. Аб гэтым заявіў учора журналістам у Добрушы старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон, які знаходзіцца ў Гомельскай вобласці з мэтай вывучэння сітуацыі ў дрэваапрацоўчай галіне, перадае БЕЛТА.**

Новае абсталяванне ўжо з верасня 2013 года павінна было працаваць на поўную магутнасць. «На жаль, папераробная машына па-ранейшаму знаходзіцца ў наладцы і, як кажуць спецыялісты, магчыма, толькі ў канцы сакавіка выйдзе на поўную магутнасць», — адзначыў Аляксандр Якабсон. У выніку аб'ём вытворчасці на фабрыцы адносна папярэдняга года склаў толькі 63,5 працэнта, знізіліся аб'ёмы экспарту, павялічылася крэдыторская запазычанасць, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі склала мінус 8,3 працэнта.

Паводле слоў кіраўніка кантрольнага ведамства, такая сітуацыя ўзнікла з-за не зусім карэктных дзеянняў пастаўшчыка абсталявання — чэшскай фірмы. «Тут праблема чэшскага боку. Яны цяпер узмоцнена працуюць, выпраўляюць сітуацыю. Мы лічым, што неабходна больш дэталёва вывучыць умовы кантракта, каб вызначыцца з наступнымі крокамі ў дачыненні да замежнага партнёра, а таксама зразумець, калі такія ёсць, пралікі нашага боку», — падкрэсліў ён.

Імпартазамяшчальны праект «Мадэрнізацыя папераробнай машыны нумар 7 для асваення вытворчасці двухслаёвай паперы для шпалераў» на Добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы» ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры» коштам 11 млн еўра быў прадугледжаны праграмай інавацыйнага развіцця Беларусі. У адпаведнасці з заяўленымі параметрамі, новая лінія павінна выпускаць 100 т двухслаёвай паперы для шпалераў за суткі. Калі б праект быў паспяхова рэалізаваны, фабрыка «Герой працы» магла б стаць адным з асноўных вытворцаў двухслаёвай паперы для шпалераў у краінах СНД і поўнасцю забяспечыць патрэбнасці беларускіх спажыўцоў.

Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў папяровай галіны Беларусі. Выпускае каля 90 відаў прадукцыі, у тым ліку паперу для шпалераў, паперу афсетную, чарцёжную, пісчую, малявальную і тавары народнага ўжытку (сшыткі школьныя, агульныя, для малявання, альбомы, блокі для малявання і чарчэння). У гэтым годзе фабрыцы споўніцца 144 гады.

# БЕЛАРУСБАНК У 2014 ГОДЗЕ БУДЗЕ КРЭДЫТАВАЦЬ ЗАКУПКІ БЕЛАРУСКАЙ ТЭХНІКІ ВА УКРАІНЕ НА ЛЬГОТНЫХ УМОВАХ

**ААТ «ААБ Беларусбанк» у 2014 годзе будзе прадастаўляць крэдыты на закупку беларускай тэхнікі на тэрыторыі Украіны на льготных умовах. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 24 ад 14 студзеня 2014 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Дакументам адобраны праект дагавора паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Публічным акцыянерным таварыствам акцыянерным банкам «Укргазбанк» аб умовах выдачы крэдытаў для набыцця ва Украіне тавараў, выробленых у Беларусі. Пастанова прынята ў адпаведнасці з указам № 466 ад 24 верасня 2009 года «Аб некаторых мерах па рэалізацыі тавараў, выробленых у Рэспубліцы Беларусь». Гэты дакумент з'яўляецца сур'ёзнай падтрымкай беларускіх экспарцёраў. Пастанова ўступае ў сілу з дня яе прыняцця.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НА ВАДОХРЫШЧА МАРОЗ ВУШЫ «КУСАЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У пачатку наступнага тыдня наша краіна трапіць пад уплыў сапраўды халодных паветраных мас арктычнага паходжання. У панядзелак і аўторак пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны чакаецца кароткачасовы снег. Стане зусім холадна. Тэмпература паветра ўначы мінус 14-20, у паўночна-ўсходніх рэгіёнах пры праясненнях да 21-25 марозу, удзень — 9-16 градусаў ніжэй за нуль. На паўднёвым захадзе ўначы мінус 8-13, удзень — 5-8 марозу.

Паводле інфармацыі айчынных кліматолагаў, сярэднесутачная тэмпература паветра 19 студзеня ў мінулыя гады ў палове выпадкаў была ў межах ад 1 да 10 марозу, раз на 7 гадоў — увогуле з плюсам, раз на 4 гады — ніжэй за мінус 10 градусаў. Прыкладна раз на 30 гадоў на гэтую дату бывае ніжэй за мінус 20. Самая нізкая тэмпература ўначы на Вадохрышча ў сталіцы была зарэгістравана ў 1968 годзе — мінус 25,8 градуса. Сёлета ўначы на гэтае свята ў галоўным мегаполісе краіны чакаецца мінус 15-17 градусаў. Зіма, мароз, цудоўна...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ІНШАЗЕМЦАЎ У БЯДЗЕ НЕ ПАКІНУЦЬ

**Дыспетчары беларускай службы выратавання ў хуткім часе будуць адказваць на званкі не толькі па-беларуску ці па-руску, але і, напрыклад, па-англійску.**

— З 1 ліпеня мінулага года з'явілася магчымасць тэлефанаваць у службу выратавання не толькі па нумары 101, але і набіраючы 112. Менавіта па апошнім нумары службу выратавання выклікаюць у Еўропе. Іншаземны грамадзянін, якому будзе патрэбна дапамога, атрымае яе ў любым выпадку, — адзначыў на прэс-канферэнцыі міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка. — Калі справа ў нашай кампетэнцыі, на выезд адправяцца супрацоўнікі МНС, калі не — званок пераадрасуюць, напрыклад, у міліцыю, — дадаў міністр.

Каб кожнага замежніка зразумелі «з паўслова», дыспетчары прайшлі падрыхтоўку па замежных мовах. Магчыма, у дапамогу спецыялістам будуць узятыя студэнты, чыя спецыяльнасць звязана з вывучэннем замежных моў.

Міністр таксама адзначыў, што ўсе аб'екты, якія будуць задзейнічаны ў правядзенні сёлетняга чэмпіянату свету па хакеі, узяты на кантроль. Спатрэбіцца нейкі час, каб супрацоўнікі МНС правялі там трэніроўкі: вельмі важна ведаць нюансы размяшчэння будынка, найкарацейшы шлях пад'езду да яго.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## СТАЛІЧНАЯ «КАМУНАЛКА» ДАРАЖЭЕ

**Ужо з 1 лютага за тэхнічнае абслугоўванне жылля мінчанам давядзецца плаціць больш на 20 працэнтаў. Новая цана складзе 600 рублёў за квадратны метр. Чакае жыхароў сталіцы і новы тарыф на паслугі водазабеспячэння.**

Мінск пачынае паступова адмаўляцца ад методыкі перакрыжаванага субсідавання камунальных паслуг, пры якой прамысловыя прадпрыемствы плацяць за спажытыя рэсурсы не толькі за сябе, але і часткова за насельніцтва.

— Кошты на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва надалей будуць павышацца адначасова са зніжэннем цэн на энерганосьбіты для прадпрыемстваў. У іх, у сваю чаргу, паменшацца выдаткі на вытворчасць прадукцыі, што дапаможа павялічыць зарплату супрацоўнікам, — заявіў намеснік начальніка ўпраўлення антыманапольнай палітыкі Мінгарвыканкама Мікалай Крыжэвіч.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## МЫЙНАЯ КАНТРАБАНДА

**Больш чым 33 тоны мыйнага сродку вядомай маркі намагаліся выдаць за больш танную прадукцыю прадстаўнікі літоўскай фірмы.**

Груз з краіны-суседкі быў змешчаны ў чыгуначны вагон, які пасля мытнага афармлення на тэрыторыі Беларусі збіраліся даставіць у Казахстан. Паводле дакументаў, мыйны сродак, які перавозіўся, быў літоўскай вытворчасці.

Супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні падчас кантролю выявілі, што насамрэч гэтыя звесткі непраўдзівыя: замест заяўленага таннага сродку ў Казахстан везлі нашмат больш дарагую прадукцыю вядомай маркі, зробленую ў Чэхіі. Да таго ж уладальнікі грузу ўтаілі і дакладную колькасць скрынак, пагружаных у вагон. Іх аказалася не 320, як пазначалася ў суправаджальных дакументах, а 1280. У выніку тавар коштам больш як 400 мільёнаў рублёў давялося канфіскаваць.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■ Факт

## БУКВАР 1914 ГОДА І СШЫТКІ ЧАСОЎ РЭВАЛЮЦЫІ

**У Пагост-Загародскай школе імя Кірылы і Мяфодзія Пінскага раёна адкрылі музей адукацыі раёна.**

Самой школе сёлета споўнілася 140 гадоў. З экспанатамі дапамог былы выпускнік школы, які цяпер жыве ў Віцебску. Ён перадаў роднай навучальнай установе дакументы і рэчы, якія шмат гадоў захоўваліся ў сямейным архіве. Сярод іх — буквар 1914 года, сшыткі 1917 года, дакумент аб заканчэнні Пагосцкага народнага вучылішча. Цэлы шэраг экспанатаў, найперш фотаздымкі, успаміны настаўнікаў розных гадоў, перадалі музею Лагішынская, Табульская школы. Напрыклад, школьную форму даваеннага часу, падручнікі 1940-х гадоў. Такім чынам экспазіцыя ўмясціла ў сябе асноўныя вехі гісторыі развіцця адукацыі на Піншчыне за апошняе стагоддзе. Ёсць тут расказы пра заслужаных настаўнікаў і славутых выпускнікоў.

Адна са старэйшых школ раёна — Пагост-Загародская — была ўключана ў праграму развіцця Прыпяцкага Палесся. На рэканструкцыю навучальнай установы з рэспубліканскіх сродкаў выдаткавана больш за тры мільярды рублёў. Каля 800 мільёнаў рублёў выдзелена на школу і з бюджэту Пінскага раёна. Пасля праведзенай рэканструкцыі і стала магчымым адкрыццё музея.

## «ТЭРАКТ» У ГАЛАВЕ

**Пра такую з'яву звычайна гавораць: дапіўся. Малады чалавек у стане моцнага алкагольнага ап'янення прыйшоў у баранавіцкі кінатэатр «Кастрычнік» і стаў крычаць, што неўзабаве тут усё ўзляціць у паветра. Ён бегаў па фае кінатэатра і крычаў, што да выбуху застаюцца хвіліны.**

Да будынка з'ехаліся ўсе службы: міліцыя, МНС, сапёры. З кінатэатра хутка эвакуявалі больш за 200 чалавек, будынак ачапілі. А «мінёр» і не думаў хавацца. Калі яго затрымалі, ён працягваў бубнець пра хуткі выбух. У свае 25 гадоў гэты чалавек мае біяграфію, аснову якой склалі тры судзімасці. Кінатэатр праверылі, ніякіх выбуховых прылад не знайшлі. І праз некалькі гадзін супрацоўнікі і наведнікі вярнуліся ў будынак.

**Яна СВЕТАВА**

# БЕЗ БОЯЗІ І АЗІРАННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Указ прадугледжвае больш жорсткі парадак прадастаўлення зямельных участкаў для будаўніцтва. У прыватнасці, забараняецца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам, адчужэнне прадастаўленых у прыватную ўласнасць для будаўніцтва капітальных будынкаў зямельных участкаў, перадача іх у арэнду, а таксама перадача правоў і абавязкаў па дагаворах арэнды зямельных участкаў да таго моманту, пакуль уласнікамі (арандатарамі) не будуць зарэгістраваны капітальныя будынкі. Больш таго, забараняецца павялічваць плошчы зямельных участкаў, што былі прадастаўлены па выніках аўкцыёнаў на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, аўкцыёнаў з умовамі на права праектавання і будаўніцтва капітальных пабудоў і аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць, а таксама змяненне мэтавага прызначэння зямельных участкаў, прадастаўленых для будаўніцтва капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), да завяршэння іх будаўніцтва.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы па капітальным будаўніцтве аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама цяпер павінны аказваць інвестару за яго кошт адпаведныя паслугі па падрыхтоўцы зямельнага ўчастка для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, калі быў заключаны інвестыцыйны дагавор з нашай краінай.

Дакументам звяртаецца ўвага да больш планавага будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры пры ўзвядзенні жылых дамоў. Напрыклад, для раёнаў (кварталаў) жылой забудовы ўстаноўлены патрабаванні да сацыяльнай інфраструктуры і складу мінімальна неабходных аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Прадастаўленне заказчыкам (забудоўшчыкам) зямельных участкаў для будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў і індывідуальнай жылой забудовы будзе ажыццяўляцца пры наяўнасці мінімальна неабходнай інфраструктуры альбо праектнай дакументацыі, якая прайшла дзяржаўную экспертызу на будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры.

Працэс паралельнага праектавання і будаўніцтва будзе з'яўляцца выключэннем з правілаў і прымяняцца толькі па рашэнні кіраўніка дзяржавы. На заканадаўчым узроўні замацавана, што архітэктурная, горадабудаўнічая і будаўнічая дзейнасць, а таксама паслугі па абследаванні будынкаў і збудаванняў ажыццяўляюцца толькі такімі суб'ектамі гаспадарання, якія маюць атэстаты адпаведнасці і атэставаны персанал. Пры гэтым кіраўніком праекта прызначаецца работнік адпаведнай кваліфікацыі альбо прыцягваецца інжынерная арганізацыя (інжынер). Асобна прадугледжана рэфармаванне камунальных унітарных прадпрыемстваў па капітальным будаўніцтве гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённых выканкамаў, адміністрацый раёнаў Мінска.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# НОВАЕ Ў БУДАЎНІЦТВЕ: З АГЛЯДКАЙ НА ТЭРМІНЫ І САЦЫЯЛЬНУЮ ІНФРАСТРУКТУРУ

**Днямі Прэзідэнт падпісаў Указ № 26 «Аб мерах па ўдасканаленні будаўнічай дзейнасці». Уладзімір ПУЗЫРЭЎСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, пракаментаваў асноўныя тэзісы новага заканадаўчага акта.**

«Указ выйшаў невыпадкова: своеасаблівай «прадмовай» да яго было з'яўленне ў краіне шматлікіх даўгабудаў — не толькі будынкаў вытворчага прызначэння, але і жылля, — адзначыў Уладзімір Пузырэўскі. — Гэта было звязана са шматлікімі недаглядамі, у тым ліку ў заканадаўчым плане». На пачатак мінулага года ў краіне налічвалася каля 390 дамоў такога кшталту ў розных рэгіёнах. Па колькасці больш за ўсё даўгабудаў налічвалася ў Мінску (81) і Мінскай вобласці (105).

Увесь мінулы год па адпаведным даручэнні кіраўніка дзяржавы гэтай праблемай займаліся ўрад, Міністэрства архітэктуры, абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты са сваімі структурнымі падраздзяленнямі. Як вынік, за мінулы год атрымалася ўвесці ў эксплуатацыю каля 200 дамоў. На 1 студзеня гэтага года засталося прыкладна 190 будынкаў, якія да 4 квартала гэтага года павінны быць уведзены ў эксплуатацыю.

Каб сітуацыя з даўгабудамі не паўтаралася ў будучыні, быў прыняты гэты ўказ. «Перш за ўсё, у дадзеным заканадаўчым акце адзначаны такія моманты, як больш жорсткі парадак па выкарыстанні зямлі, — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі. — Гэта значыць, што калі ўчастак атрыманы інвестарам для будаўніцтва дома, то ён павінен выкарыстоўвацца толькі пад будаўніцтва дома. Перадаваць гэты ўчастак, як і выкарыстоўваць для іншых мэт, павялічваць або змяншаць яго плошчу забаронена».

Акрамя гэтага, указам вызначана, што, напрыклад, для будаўніцтва жылля зямельны ўчастак можа быць выдзелены толькі тады, калі там будзе адпаведная інфраструктура. Маецца на ўвазе не толькі падвод вады, газу, электрычнасці, але і так званая сацыяльная інфраструктура. «Калі гэтага не будзе, то павінен быць хаця б намер мясцовага выканаўчага органа, пацверджаны адпаведнай праектна-каштарыснай дакументацыяй, што там у бліжэйшы час будуць пабудаваны неабходныя крамы, дзіцячыя садкі, школы», — падкрэсліў парламентарый.

Наступным момантам, адлюстраваным ва ўказе, з'яўляецца тое, што абаронены правы забудоўшчыка — чалавека, які будуе гэтае жыллё. «Перад пачаткам будоўлі будзе заключацца тыпавы дагавор, — патлумачыў спадар Пузырэўскі, — аднолькавы і для будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай, і для так званага «арэнднага» жылля. У дагаворы будуць прапісаны тэрміны пачатку і заканчэння будаўніцтва дома».

Асаблівасцю ў гэтым выпадку з'яўляецца тое, што ўпраўленне капітальнага будаўніцтва будзе кантраляваць узвядзенне не толькі дзяржаўнага жылля, але і долевага. Так, перш чым набраць дольшчыкаў для будаўніцтва такога дома, інвестар абавязаны будзе не менш, чым 15% кошту будаўніцтва прафінансаваць за ўласныя сродкі. Толькі пасля гэтага ён будзе выкарыстоўваць грошы грамадзян, якія прымуць удзел у долевым будаўніцтве. Акрамя таго, на розных этапах будаўніцтва будзе праводзіцца кантроль, і калі з тэрмінамі будуць спазненні, адказныя кіраўнікі, чыноўнікі панясуць пакаранне: штраф складзе да 500 базавых велічынь.

Плануецца, што ў перыяд будаўніцтва гарантыйны тэрмін пасля ўводу дома складзе не менш за пяць гадоў і на выпраўленне недапрацовак адразу будуць рэзервавацца грошы ў аб'ёме як мінімум 1,5% ад усяго кошту дома. Другі варыянт: у фірмы павінен быць дагавор з банкам, які пацвердзіць, што ў выпадку скаргаў ад грамадзян банк выдасць гэтай будаўнічай арганізацыі неабходную суму, каб правесці неабходны капітальны рамонт.

Па словах **Аляксея КУЗЬМІЧА, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве,** гэты ўказ дапаможа пазбегнуць неэфектыўных праектаў у галіне будаўніцтва. Парламентарый мяркуе, што заканадаўчы акт выключыць у тым ліку і паралельнае праектаванне. Аляксей Кузьміч падкрэсліў, што калі ідзе будаўніцтва аб'екта і паралельнае яго праектаванне, то пачынаюцца ўдакладненні праекта, а гэта вядзе за сабой велізарны перарасход сродкаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*Адным з распрацоўшчыкаў гэтага дакумента былі спецыялісты Мінбудархітэктуры. У прыватнасці,* ***начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі міністэрства Аляксандр ГОРВАЛЬ*** *паведаміў карэспандэнту «Звязды», што даволі слушным новаўвядзеннем ва ўказе стане абавязковае ўзвядзенне арганізатарамі долевага будаўніцтва 15% жыллёвага аб'екта за ўласныя сродкі. Фактычна гэта нулявы цыкл і першы паверх (ці яго частка) шматкватэрнага дома. Толькі потым камерцыйная арганізацыя зможа прыцягваць сродкі дольшчыкаў.*

*Наш эксперт упэўнены, што гэтая норма дазволіць дакладна праверыць заказчыка на сур'ёзнасць яго намеру, ужо на папярэднім этапе адсеяць патэнцыяльных нядобрасумленных забудоўшчыкаў, выбраць найбольш падрыхтаваных, якія не падвядуць. Цяпер у грамадзян стане больш упэўненасці, што па сістэме долевага будаўніцтва яны не трапяць «на сцяжынку» даўгабуду.*

*Ёсць ва ўказе кіраўніка дзяржавы і яшчэ адна прыемная навіна для шараговых забудоўшчыкаў. Раней ад адлічэнняў, па ўсярэдненай норме зносу аб'екта, вызваляліся толькі тыя, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і будаваў жыллё з выкарыстаннем сістэмы дзяржаўнай падтрымкі. Цяпер ад аплаты, згодна такой нормай, будуць вызваляцца ўсе чаргавікі па любой схеме шматкватэрнага будаўніцтва. Дарэчы, у грашовым вымярэнні ўсярэдненая норма зносу аб'екта па горадзе Мінску летась склала 7,2% ад агульнага кошту кватэры. Падобнае новаўвядзенне павінна сёлета зрабіць будаўніцтва жылля таннейшым менавіта для тых чаргавікоў, якія будуюць сабе кватэры без выкарыстання дзяржаўнай падтрымкі.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовский пищеторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:**
**здание кулинарного магазина,**
**инвентарный номер № 610/С-14371, общей площадью 68.1 кв.м,** расположено на земельном участке площадью **0,0100 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Чапаева, 40а.** Недвижимое имущество обременено договором аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 345 841 200 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (34 904 000 бел. руб.)**;

**Лот № 2:**
**здание приемного пункта стеклотары № 7,**
**инвентарный номер № 610/С-44616, общей площадью 59,2 кв.м,** расположено на земельном участке площадью **0,0230 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, г. Борисов, ул. Павла Рака, 65.** Недвижимое имущество обременено договором аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 190 562 400 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (19 056 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **18.02.2014** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.02.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

■ Глядзіце!

# ТЭЛЕПРАЕКТ «Я СПЯВАЮ!»: ПЕСНІ, ЛЁСЫ І СЛЁЗЫ

**У бліжэйшую суботу, 18 студзеня, бярэ старт, бадай, самае добрае і кранальнае шоу тэлеканала АНТ — чацвёрты сезон дзіцячага музычнага конкурсу «Я спяваю!»**

За тры гады, што існуе праект, ён не толькі адкрыў для шырокай публікі амаль 3 дзясяткі імёнаў юных выканаўцаў, але і дапамог спраўдзіцца мноству дзіцячых мар. Бо ўсе яго ўдзельнікі — адабраныя па выніках кастынгаў адораныя дзеці, якія жывуць у няпростых умовах. Хтосьці з іх расце ў шматдзетнай сям'і, у кагосьці застаўся толькі адзін з бацькоў, а іншыя наогул выхоўваюцца ў дзіцячым доме. Але ўсе яны, без выключэння, вельмі моцныя, светлыя, творчыя і вельмі таленавітыя.

У чацвёртым сезоне праекта шанц выйсці на вялікую сцэну, самім і ў дуэтах са знакамітымі артыстамі выканаць для ўсёй краіны найскладанейшыя кампазіцыі з рэпертуару беларускіх, расійскіх і замежных выканаўцаў, атрымалі 10 дзяцей. Пра выпрабаванні лёсу, якія кожны з іх перажыў, яскрава сведчаць скупыя радкі з візітовак удзельнікаў. Мінчанак Арыну Дабралюбаву і самую маленькую ўдзельніцу праекта, 6-гадовую Мілану Бародка выхоўваюць толькі мамы; сям'я Лізы Няборскай з Мар'інай Горкі выхоўвае семярых дзетак; брастаўчанін Дзіма Стасюк, абодва бацькі якога былі інвалідамі па зроку, не так даўно страціў бацьку; Аляксандру Казлову з Оршы, як і яшчэ траіх дзяцей у гэтай сям'і, выхоўвае бабуля, бо маці пазбаўлена бацькоўскіх правоў, а Альбіна Грышкевіч з Моўчадскай школы-інтэрната Баранавіцкага раёна — з дзяцінства сама сабе сурдаперакладчык, бо ў яе шматдзетнай сям'і самы блізкі чалавек — мама — не можа чуць і гаварыць. Але пры ўсім тым гэтыя хлопчыкі і дзяўчаты ўмеюць нястомна працаваць, моцна сябраваць, верыць у лепшае і спяваць настолькі пранікнёна, што дарослыя не стрымліваюць слёз…

Здымкі чарговай часткі праекта «Я спяваю!» ужо завершаны, але ў эфір ён трапіць толькі з 18 студзеня. Таму і ў саміх юных удзельнікаў, і ў іх сяброў і блізкіх, як, зрэшты, ва ўсіх гледачоў ёсць магчымасць перажыць эмоцыі кожнага выступлення наноў.



У першым канцэрце маленькія артысты ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна (гэта значыць, жыўцом, без фанаграмы) выканаюць песні вядомых беларускіх артыстаў. Ацэньваць выступленні давядзецца суддзям праекта — спявачцы Ісгуі Абалян, кампазітару Алегу Елісеенкаву і тэлевядучай Марыне Грыцук, а падтрымліваць удзельнікаў будзе нязменны вядучы конкурсу, вядомы рэжысёр тэатра і кіно, пры тым бацька шасці дзяцей Дзмітрый Астрахан.





Праз тыдзень удзельнікі шоу парадуюць слых бардаўскімі песнямі з рэпертуару Таццяны і Сяргея Нікіціных, а таксама прымусяць перажываць спецыяльнага госця праекта, народную артыстку Расіі Ірыну Мураўёву. У наступных выпусках «Я спяваю!» прагучаць замежныя хіты — пры падтрымцы і непасрэдным удзеле гурта «Nevergreen», песні з рэпертуару вядомага расійскага спевака і кампазітара Ігара Нікалаева, а таксама дуэтныя кампазіцыі з выпускнікамі тэлешоу «Акадэмія талентаў».

Імя пераможцы традыцыйна будзе названа на фінальным гала-канцэрце. Але хочацца спадзявацца, што, незалежна ад вынікаў праекта, кожны з удзельнікаў атрымае сваю перамогу і сваю пуцёўку ў новае жыццё.

**Дзе**: АНТ.

**Калі**: па суботах у 17.35.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота: прэс-служба АНТ**

# СВОЕЧАСОВА ПАСТАВІЦЬ КРОПКУ



**У адказ на абурэнне часткі гледачоў і прэтэнзіі ўдзельнікаў нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне», якія лічаць, што праігнаравана меркаванне грамадскасці, Белтэлерадыёкампанія дала афіцыйны каментарый сітуацыі.**

«У выніку адначасовага глядацкага і суддзейскага галасавання роўную колькасць балаў у фінале атрымалі два выканаўцы — Тэа і дуэт Макс Лорэнс&ДзіДзюЛя. У поўнай адпаведнасці з п. 27 арт. 6 палажэння аб правядзенні Нацыянальнага адборачнага тура Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу песні «Еўрабачанне-2014»: «У выпадку калі два і больш удзельнікі фіналу праекта набіраюць роўную колькасць балаў, пераможца праекта вызначаецца дадатковым адкрытым галасаваннем прафесійнага журы». Так гаворыцца ў паведамленні прэс-службы. Акрамя таго, падкрэсліваюць прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі, першае галасаванне журы рэгламентавана тымі ж 10 хвілінамі, якія адведзены на галасаванне тэлегледачоў, а пасля падпісаныя кожным з суддзяў пратаколы перадаюцца на апрацоўку ў спецыяльную падліковую камісію. «У гэтых умовах сцвярджаць, што члены журы грэбавалі чыімсьці меркаваннем ці мелі магчымасць «падкарэктаваць» сваю пазіцыю, — значыць грашыць супраць ісціны. Акрамя таго, журы ўпаўнаважана здзяйсняць галасаванне і пры адсутнасці аднаго з яго членаў», — адзначана ў прэс-рэлізе.

Вынікі адбору вядомыя ўжо ўсім, хто сочыць за конкурсам: прадстаўніком Беларусі на «Еўрабачанні-2014» у Капенгагене стаў спявак Тэа (Юрый Вашчук) з песняй «Cheesecake». «Можна пагаджацца ці спрачацца з дзеючым палажэннем аб конкурсе, аднак пажадана проста ўважліва яго вывучыць і толькі пасля гэтага прымаць рашэнне наконт удзелу ў адборы», — рэзюмуе прэс-служба.

Што ж да пытання з боку ўдзельнікаў, якія набралі аднолькавую колькасць балаў у галасаванні журы (а менавіта: па якім прынцыпе камп'ютарная праграма паставіла адных выканаўцаў вышэй за другіх?), — у гэтым пункце дзейнічаюць традыцыйныя правілы «Еўрабачання». «У гэтым конкурсе не бывае двух другіх ці двух трэціх месцаў, — патлумачыла «Звяздзе» кіраўнік прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі Святлана Смалонская-Краскоўская, — і пры роўнай колькасці балаў у некалькіх выканаўцаў для вызначэння таго, хто якое месца заняў, спачатку адкідваюцца самыя высокія і самыя нізкія ацэнкі, а потым параўноўваюць, у каго засталося больш высокіх балаў». У выпадку гурта «Switter boys» і дуэта Макс Лорэнс&ДзіДзюЛя, у першых адкінуць трэба ацэнкі 3 і 10, у другіх — 5 і 7 адпаведна. У гурта застаюцца ў актыве яшчэ 10 і 8, у дуэта — некалькі 7, таму «Switter boys» і ўзняліся на прыступку вышэй. Што, зрэшты, не адмяняе таго, што няблага было б данесці гэтыя правілы да ўсіх удзельнікаў адбору, суддзяў і гледачоў загадзя, але ніяк не постфактум.

**МІЖ ІНШЫМ**

***У 1969 годзе на «Еўрабачанні» здарыўся выпадак, калі адразу 4 краіны — Францыя, Іспанія, Нідэрланды і Вялікабрытанія — набралі аднолькавую колькасць балаў. Паколькі на той час ніякай працэдуры вырашэння гэтага спрэчнага моманту не існавала, усе чатыры былі названы пераможцамі. Пазней былі прыняты некалькі правілаў для вызначэння пераможцаў сярод уладальнікаў аднолькавых балаў: так, найперш улічваецца, за каго прагаласавала найбольш краін-удзельніц (незалежна ад ацэнкі), потым параўноўваецца, у каго больш ацэнак 12, 10 і г.д. па шкале зверху ўніз. Толькі ў выпадку, калі ўсе гэтыя паказчыкі абсалютна роўныя, пераможцамі могуць стаць дзве ці некалькі краін. Прынцып параўнання колькасці высокіх ацэнак быў прыменены ў 1991 годзе, калі роўную колькасць балаў атрымалі прадстаўнікі Швецыі і Францыі. У Швецыі аказалася больш «дзясятак», таму ёй і аддалі пальму першынства.***

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# АБ ЖАНЧЫНАХ І ІХ «ДОБЛЕСЦЯХ»



## Безумоўная «гендарная роўнасць» — гэта добра ці ўсё-такі не вельмі?

НЕКАЛЬКІ дзён беларуская інтэрнэт-супольнасць актыўна абмяркоўвала навіну з серыі «скандалы-кур'ёзы». У адным са сталічных начных клубаў пабіліся дзве дзяўчыны. Хто першы пачаў «разборкі» і перайшоў ад слоў да кулакоў — пра тое дакладна ведаюць толькі сцены клубнай, выбачайце, прыбіральні, дзе, уласна, «дуэль» і адбывалася. Мітлушылі дзявулі адна адну не жартуючы: у паказаннях фігуруюць вырваныя валасы, драпіны, гематомы ды парванае адзенне. Міліцыя вядзе разбіральніцтва, бо ў наяўнасці як мінімум хуліганства…

Байнет крыху пагудзеў аб гэтым, а праз пару дзён і забыўся: з'явіліся новыя навіны, новыя скандалы. Сотні каментарыяў проста засталіся ў гісторыі глабальнай сеткі і цікавыя сёння хіба што самім удзельніцам канфлікту. Але гэтыя меркаванні карыстальнікаў інтэрнэту вартыя ўвагі ведаеце чаму? У іх было ўсё: і жарты, што дзяўчаты не падзялілі мужыка, і нараканні на ахову клуба і на клубны кантынгент увогуле, і вясёлыя ўспаміны аб падобных гісторыях, і разважанні кшталту «вось што гарэлка ды ўсёдазволенасць робяць»… Пры гэтым ніхто (я ўважліва перагледзела ўсе без выключэння каментарыі) не напісаў простую і такую, здавалася б, зразумелую рэч: гэта не па-жаноцку, гэта сорамна для дзяўчыны, так не павінна быць.

І я здагадваюся, чаму ніхто не выказаў гэтую думку. Бо мы (прынамсі большасць з нас) даўно так не лічым. З гонарам гаворым пра «гендарную роўнасць», пра роўныя правы, пра тое, што «слабы пол» ужо даўно зусім не слабы. А раз так — значыць, можна ўсё. Нават тое, што яшчэ нядаўна дазвалялася выключна мужчынам, прычым вельмі ўмоўна. І ў выніку — маем што маем.

ПА прыклады далёка хадзіць не трэба. Я перагледзела зводкі здарэнняў літаральна за тры апошнія тыдні, у якіх фігурантамі былі жанчыны. Тут далёка не ўсе: я выбрала самыя, калі можна так сказаць, тыповыя.

Гэта, напрыклад, з Гомеля: «Раніцай пасля застолля Каця выпырхнула з кватэры і пайшла па справах. Вяртаючыся, сустрэла наглядна знаёмага ёй мужчыну, які прапанаваў выпіць за надыходзячае свята ў яго дома. Дзяўчына з лёгкасцю згадзілася. Вечарам выпадковы сабутэльнік давёў добра п'яную Кацярыну дадому і пакінуў каля пад'езда»… А дома ўхажор яе проста парэзаў, дапытваючыся, з кім дзяўчына была.

А гэта паведамленне ўжо ад гродзенскіх праваахоўнікаў: «47-гадовая жанчына завінавацілася больш за 600 тысяч рублёў Фонду сацыяльнай абароны і каля 80 тысяч рублёў жыллёва-камунальнай службе. Яе дачка адмовілася аплаціць тры штрафы за безбілетны праезд у аўтобусах і тралейбусе. Да даўжніц выехалі судовыя выканаўцы. Жанчыны праявілі крайнюю агрэсіўнасць. Пачалі з абразы адказных асоб, а затым пусцілі ў ход кулакі. А калі судовыя выканаўцы выклікалі міліцыю, схаваліся ў кватэры і замкнуліся там…»

А гродзенскія ДАІшнікі ў 8.40 раніцы лавілі даму на «Сітраэне», які ехаў зігзагамі. Злавілі — і жахнуліся: у дамы ў крыві алкаголю ў шэсць разоў больш за дапушчальны ўзровень, а ў салоне — двое малых дзяцей, яна іх у садок везла…

Не ведаеш, ці то з прыкрасцю ўсміхацца, ці то плакаць, чытаючы гэтыя паведамленні. Шчыра: найбольш хочацца плакаць, асабліва калі ў зводках вось гэта, якую інфармацыйная лента прынесла акурат калі матэрыял ужо быў амаль гатовы: «Пажар здарыўся вечарам у вёсцы Бережное Столінскага раёна. Маці пакінула дзяцей без нагляду і, замкнуўшы іх з вуліцы, пайшла ў краму. Да прыбыцця выратавальнікаў жанчына вынесла дзяцей з дома, які палаў. У раённай бальніцы Століна паведамілі, што ўсе трое малых памерлі… З верасня мінулага года сям'я значыцца на ўліку як сацыяльна ненадзейная. Маці злоўжывае спіртным…»

ПРЫЗНАЙЦЕСЯ, вы чыталі гэтую «тэматычную падборку» з прыкрасцю, з агідай, з жалем. Але зусім не звярнулі ўвагі на тое, мужчыны ў ёй фігуруюць ці жанчыны, каб аўтарка гэтых радкоў не засяродзілася на гэтым з самага пачатку. Можа, у безумоўнай роўнасці з мужчынамі, якой грамадская думка трывала нас, жанчын, надзяліла, і ёсць прычына таго, што падобны «дайджэст» навін з удзелам «цудоўнай паловы чалавецтва» можна рабіць штотыдзень?

«Яны ж, нават моцныя, крышку мімозы, іх трэба любіць на гэтай зямлі», — запярэчыць мне нехта словамі паэта. Але гэта не пра сённяшніх «гераінь» напісана. Гэта пра амаль стагадовую бабулю, якая выхавала дачок і ўнучак па ўсіх правілах вясковай ветлівасці і далікатнасці, якая сама і сёння застаецца ўзорам гэтай далікатнасці і шляхетнасці. І толькі самыя блізкія яе людзі ведаюць пра тое, як у вайну яна, дваццацітрохгадовая, сама капала магілу свайму мужу, расстралянаму і спаленаму фашыстамі за сувязь з партызанамі, хавала яго, загарнуўшы костачкі ў прасціну, бо ніхто з вясковых мужыкоў не пагадзіўся дапамагчы. Гэта пра маці хлопчыка-аўтыста, якая нікуды не аддала хворага сына і водзіць яго па тэатрах і на выставы, а ён малюе ёй дзівосныя карціны. Гэта пра звычайную кабету, якая ўсё жыццё адпрацавала на ферме, без мужа, які рана памёр, паставіла на ногі дзевяцярых дзяцей, але ні разу ў жыцці не мацюкнулася, і нават жывёлу кляла толькі: «Каб табе добра было»…

У майго любімага пісьменніка і публіцыста іспанца Артура Пераса-Рывертэ ёсць адно вельмі цікавае эсэ «Аб жанчынах і мужчынскіх доблесцях», у якім ён тлумачыць чытачам, чаму гераінь сваіх твораў надзяляе традыцыйна «мужчынскімі» рысамі — смеласцю, высакародствам, мужнасцю. Аўтар крыху пафасна піша: «Цяпер, сярод сумятні і мітусні блізкай ночы, якая насоўваецца на нас, халодная, як камп'ютары, жанчыны могуць у рэшце рэшт стаць для культуры тым самым, чым былі сярэднявечныя манахі ў акопах сваіх манастыроў у той час, калі ўвесь свет знаходзіўся на мяжы знішчэння»…

Вось сяджу і думаю: а ці шмат у нас цяпер вось такіх набярэцца?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Медыяпрастора

# «КІНАМЕТРАЖ»

| | |
|---|---|
| Брэст | 106.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM |
| Мінск | 107.1 FM |
| Гродна | 104.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM |
| Бабруйск | 103.6 FM |
| Баранавічы | 98.4 FM |
| Салігорск | 104.3 FM |
| Пінск | 103.2 FM |

Складзены рэйтынг самых касавых фільмаў 2013 года ў Беларусі. Лідарам стаў «Жалезны чалавек-3». Паглядзець яго ў кінатэатры прыйшло амаль 200 тысяч гледачоў. У выніку — першае месца і 380 тысяч долараў збораў па ўсёй Беларусі. «Хобіт: пустка Смаўга» на другой пазіцыі. Фэнтэзі зарабіла ўсяго на 12 тысяч долараў менш, чым кінакомікс. На трэцім — «Фарсаж-6» — амаль 320 тысяч долараў. Пра ўсе дзесяць кінахітоў 2013-га, а таксама аб самых перспектыўных прэм'ерах 2014 года вы можаце пачуць, калі ў пятніцу ў 14.45 настроіце хвалю радыё «Мір». У праграме «Кінаметраж» заўсёды можна высветліць, хто сёння ў лідарах пракату, зазірнуць на сусветныя здымачныя пляцоўкі і даведацца, чым жа нас неўзабаве здзівяць вядомыя рэжысёры і ў каго пераўвасобіліся «зоркі» першай велічыні.

Будзьце ў курсе кінападзей і глядзіце якаснае і добрае кіно!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 20 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Камедыя «Карнавальная ноч».**
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10, 0.50** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.15 Меладрама «Кахаць нельга забыцца».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Трылер «Тры дні на ўцёкі».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Адмірал». Заключныя серыі.**
**23.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Адзін цень на дваіх». 1-я серыя.**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 23.45 Серыял «Прыгоды натарыуса Неглінцава».**
**12.00 Меладрама «Дунечка».**
**13.55 Маст. фільм «Цягнік па-за раскладам».**
**15.25 Камедыя «Дэжа вю».**
**17.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**19.00 Серыял «Маскоўскі дворык». 1-я і 2-я серыі.**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Інтэрны».**
**22.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**0.45** Хакей. КХЛ. «Барыс» — «Дынама» (Мінск).

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.00, 19.10, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.10, 0.30** «Год у гісторыі».
**8.20** «Цуды прыроды». Патагонія, Венгрыя. Беліз. Новая Зеландыя.
**8.55** «Майстры і чаляднікі». Кераміка.
**9.20** «Спецыяльны рэпартаж». Творчасць ансамбля «Сябры».
**9.35, 20.50 Серыял «Мегрэ».**
**10.20, 21.40** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.50 «Смешная лэдзі». Маст. фільм.**
**13.20, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста СССР Здзіслава Стомы.
**13.50, 23.15** «Генералы супраць генералаў». Дак. фільм. 1-я серыя.
**14.30** «Наша спадчына». Эпоха класіцызму і рамантызму.
**14.40** «Аляксандр Мядзведзь». Чалавек-легенда. Дак. фільм.
**15.15** Канцэрт. Людвіг ван Бетховен. Сімфонія № 9.
**16.20** «Наперад у мінулае».
**16.50** М/ф.
**17.15** «Пейзажы скрозь час».
**17.50** «Карані».
**18.15** «Палескі пачастунак». Язык тушаны з гароднінай.
**18.30** «Нёман». Дак. фільм.
**19.20 «Падкідыш». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**22.10 «Час для роздуму». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Чэлсі» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Суонсі» — «Тотэнхэм».
**11.55, 13.20, 18.15, 20.15** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Матч асноўнага раўнда.
**14.50** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Гонка праследавання. Мужчыны.
**15.50** Хакей. КХЛ. «Барыс» — «Дынама» (Мінск).
**19.45** Авертайм.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Вест Бромвіч» — «Эвертан».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Народжаныя рэвалюцыяй. Дзяржынскі супраць Пілсудскага».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «15 гадоў на сцэне». Юбілейны канцэрт Сашы Нема.
**23.35 Камедыя «Мялінда і Мялінда».**
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Сямейныя драмы».
**14.25** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «CoverDuck» супраць «Дежавю».
**15.35** «Не хлусі мне!».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Вялікія тайны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Целаахоўнік».**
**22.10** «Глядзець усім!».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15, 18.20 Серыял «Метад Лаўровай».**
**10.10, 0.25 Маст. фільм «Бяром усё на сябе».**
**11.30** «Наша марка».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20, 3.15 Серыял «Клон».**
**13.55** Дак. фільм «Рэальны свет».
**15.20, 23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Суд».**
**21.20 Серыял «Па той бок ваўкоў».**
**23.05** «Беларусь сёння».
**1.45 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Старацелі марскіх глыбінь. Знайсці затанулыя мільярды».
**15.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55** «Шукальнікі».
**20.40 Серыял «Шэф паліцыі».**
**21.45 Серыял «Дзве зімы і тры лета».**
**23.35 Серыял «Тайны следства».**
**0.40** «Хто заплаціў Леніну? Тайна стагоддзя».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Ты не паверыш!».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Серыял «Шаман».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.25, 19.35, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**7.10 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.00, 18.00 Серыял «Касл».**
**10.35 «Сінематограф». Драма «Попел і алмаз».**
**12.30 Меладрама «Харысты».**
**14.15 Серыял «Эма».**
**16.10** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Гімнасткі».**
**19.40 Серыял «Вострыя казыркі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Спакуса».**
**23.00 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».**

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Аманда О».**
**10.00** «Ежа па правілах і без».
**11.00** «Астралогія кахання».
**12.00** «Дом мары».
**12.30** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**13.00, 18.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Жарты анёла».**
**20.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**21.10 Серыял «Фізіка або хімія».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 Рэтраспектыва фільмаў Бастэра Кітана. «Радня маёй жонкі», «Любоўнае гняздзечка», «Чыгуначнік». Маст. фільмы.**
**11.30** Мы і яны. «Малпін востраў». Дак. фільм.
**12.15** «Франсіска Гоя». Дак. фільм.
**12.25, 21.10** «Музейныя тайны». Дак. серыял.
**13.10 «Баязет». Серыял.**
**14.10** «Урокі малявання».
**14.40 «Барыс Гадуноў». Маст. фільм.**
**17.05** «80 гадоў Уладзіміру Дашкевічу». «Лінія жыцця».
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.15** «Правілы жыцця». Ток-шоу.
**19.45** «Астравы». Пётр Вайль.
**20.25** «Тым часам».
**22.00** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**22.50** «Начныя летапісы Генадзя Даброва». Дак. фільм.
**23.30** Дакументальная камера. «Музыка і кіно: у пошуках месца сустрэчы».
**0.10** П.І. Чайкоўскі. Скрыпічныя сола з балетаў «Спячая прыгажуня» і «Лебядзінае возера».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «СевАлогія».
**6.20** «КВЗ». Фінальная сустрэча каманд МДУ—ДДУ—НДУ. 1987/88 гг.
**8.20** «Блакітны агеньчык». 1962 год.
**9.00** «Дзе б ні працаваць...». Музычнае прадстаўленне. 1987 год.
**10.25** «Пакуль усе дома». 1993 год.
**11.00** «И никуда уже не деться...». Канцэрт Ігара Карнелюка. 1992 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Шчаслівы выпадак». 1992 год.
**14.00** «Навіны поп-музыкі». 1990 год.
**15.40** «Майстры мастацтваў». Н.а. СССР Данатас Баніёніс. 1984 год.
**17.00** «...Да 16 і старэйшым». 1990 год.
**17.45** «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль «Абсалютная абарона». 1989 год.
**18.20** «Маленькі канцэрт».
**18.35** «Дзесяць дзён, якія ўсхвалявалі свет». Спектакль маскоўскага тэатра на Таганцы. 1987 год.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Музычны рынг». З удзелам японскай групы «Шауя» і Ла Тоі Джэксан. 1989 год.
**23.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока».
**0.30** «Камедыя памылак». Тэлефільм.
**1.40** «Лялечны тэатр». Дак. фільм.
**4.00** «Кінапанарама». 1989 год. 1-я частка.

### EUROSPORT

**5.00, 12.45, 18.45, 23.00, 3.00** Тэніс. Australian Open.
**12.30, 20.15, 2.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**16.30** Шары. Чэмпіянат свету.
**20.45, 2.00** Футбол. Еўрагалы.
**21.00, 2.15** Вось гэта дзіва!!!
**21.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 2.20** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**6.00, 7.45, 8.45, 10.45, 13.50, 15.45, 20.40, 1.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Бі і крычы».
**9.00** Камедыя «Прывітанне, бывай!».
**11.15** Камедыя «Дзядзечка Бак».
**13.25, 16.00, 21.00** Серыял «Як не варта жыць».
**14.10** Меладрама «Аўтобусны прыпынак».
**17.20** Камедыя «Флінстоўны ў Рок-Вегасе».
**19.20** Меладрама «Ананімныя рамантыкі».
**22.10** Камедыя «Мозг».
**0.10** Дэтэктыў «План «Б».
**3.25** Мюзікл «Другі хор».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 2.55** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Ала Сігалава.
**14.30** «Сто пытанняў дарослому». Аляксей Ягудзін.
**15.15, 0.10, 5.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**20.20** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял.
**21.20, 4.30** «Інкасатары». Серыял.
**22.30** «Чорная скрыня». Маст. фільм.
**0.55** «Быць чалавекам». Серыял.
**2.00** «Часова даступны». Лізавета Баярская.

### ТБ1000

**5.00** Камедыя «Па версіі Барні».
**7.20** Драма «Чарадзейная краіна».
**9.10** Камедыя «Поўнач у Парыжы».
**11.00** Драма «Дом ля возера».
**13.00** Трагікамедыя «Пажыццёва».
**15.00** Камедыя «Шчаслівчык».
**17.15** Драма «Каханне і гонар».
**19.00** Драма «Лэдзі».
**21.20** Трылер «Вобласці цемры».
**23.10** Трылер «Сачэнне».
**1.00** Драма «Баец».
**3.00** Драма «Апошняя заслона».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Меладрама «Свабоднае плаванне».
**8.00** М/ф «Іван Царэвіч і шэры воўк».
**10.00** Камедыя «Дзень радыё».
**12.00** Маст. фільм «Стрэлы Робін Гуда».
**13.40** Драма «Гогаль. Найбліжэйшы».
**15.40** Драма «Матч».
**18.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**20.00** Камедыя «Шчаслівы канец».
**22.00** Камедыя «Рэальны тата».
**0.00** Камедыя «Здзелка».
**2.00** Камедыя «Жаніцьба».
**4.00** Трагікамедыя «Пяць зорак».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**6.00, 12.00, 15.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**7.00** Тайны гуансійскіх пячор.
**8.00** Грашовае сховішча ЗША.
**9.00** Гісторыя небаскробаў.
**10.00, 17.00** Мегазаводы.
**11.00** Шукальнікі скарбаў.
**13.00** Злавіць сома.
**14.00** Горад мурашак.
**16.00, 2.00** Канвоі: бітва за Атлантыку.
**18.00** Цяжкае золата Аляскі.
**19.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**20.00, 0.00, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**22.00** Расследаванні авіякатастроф.
**23.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**7.00** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**7.50, 13.15** Майстры выжывання.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Навука магіі.
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.25** Асаблівае меню Беара Грылса.
**17.20, 3.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Як уладкавана Зямля.
**19.10** Сістэма кіравання.
**21.00** Эд Стафард: як выжыць на бязлюдным востраве.
**22.00** Беар Грылс: кадры выратавання.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.00, 5.10** Нябачныя светы.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## ПЯТНІЦА, 24 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10** Зона Х.
**9.10, 15.25 Серыял «Сэрца Марыі».**
**10.10, 16.25 Серыял «Джамайка».**
**11.05, 19.50 Серыял «Двайное жыццё».**
**12.10, 1.05** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.10 Драма «Вольф Месінг: Які бачыў скрозь час».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.15** «Без права на дубль». Андрэй Растоцкі.
**18.10** Тайны следства.
**19.20, 0.05** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55 Трылер «Забытае».**
**23.40** Журналісцкае расследаванне.
**0.50** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Адзін цень на дваіх».**
**10.15** Цела чалавека.
**10.50 Меладрама «Кветкі правінцыі».**
**12.40 Серыял «Маскоўскі дворык». Заключныя серыі.**
**14.40 Серыял «Інтэрны».**
**15.45 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**16.50** Імперыя песні.
**19.00 Фантастыка «Двухсотгадовы чалавек».**
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.35** Рэпарцёр.
**23.25** «Comedy woman».
**0.15 Драма «Супер Майк».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.05, 18.10, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.15, 0.05** «Год у гісторыі».
**8.20** «Таямніца душы». Гродзенская семінарыя.
**8.55** «Карані».
**9.20** «Музеум». Шэдэўры беларускага іканапісу.
**9.35, 20.50 Серыял «Мегрэ».**
**10.20, 21.35** «Сіла веры».
**10.50 «Правадыр — Белае Пяро». Маст. фільм.**
**12.30, 23.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Анатоля Багатырова.
**12.55, 22.50** «Магія слова і гуку».
**13.35** «Шляхамі Адама Міцкевіча».
**14.05** «Пейзажы скрозь час».
**14.30** «Палескі пачастунак». Грачанікі.
**14.45** «Скарбніца Магілёўшчыны». Горад-скарб.
**15.15 «Я помню». Маст. фільм.**
**16.45** М/ф.
**17.15** «Масква—Мінск. Кінатранзіт». Барыс Плотнікаў. «Узыходжанне». Дак. фільм.
**17.40** «Цуды прыроды». Коста-Рыка. Кенія.
**18.20 «Першы рыцар». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**22.05** VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета. Канцэрт.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**10.00** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Поўначсталь».
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**13.45** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — ВЭФ-Рыга.
**15.25** Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен. Фінал. Азаранка В. — Вільямс С.
**17.30** Фактар сілы.
**18.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва» (Мінск).
**20.25, 22.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/2 фіналу.
**22.05** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здароўечка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Ісціна дзесьці побач».
**15.25** «Адваротны адлік». «Беразіно». Пастка для Скарцэні».
**16.15 Маст. фільм «Мы з вамі дзесьці сустракаліся».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**21.05** «Вячэрні Мінск».
**22.25 Маст. фільм «Паляўнічы».**
**0.25 Камедыя «Усе ў захапленні ад Мэры».**
**2.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Нам і не снілася»: «Магія ўлады».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «Вовачка». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50 Трылер «Пункт назначэння 2».**
**15.35** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Вампіркі».**
**22.00, 23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.40** «Ежа багоў».
**0.35** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**1.20 Маст. фільм «Чатырыста ўдараў».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15 Серыял «Метад Лаўровай».**
**10.00, 22.30 Маст. фільм «Ленінградская сімфонія».**
**11.30** «Сардэчна запрашаем».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Клон».**
**14.05** Дак. фільм «Рэальны свет».
**15.20** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**16.10 Серыял «Суд».**
**18.20 Маст. фільм «Калі зацвіце багун».**
**21.35** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**0.10** Кубак Садружнасці-2014. Цырымонія адкрыцця турніру.
**1.45** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Украіна — Кыргызстан.
**3.20** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Расія — Малдова.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.40 Серыял «МУР».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**14.20** Дзённік Сочы 2014.
**14.30** «Забойцы з космасу».
**15.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**16.30** «Мая планета».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Зязюля».**
**20.40** «Смяяцца дазваляецца».
**21.45 Серыял «Дзве зімы і тры лета».**
**23.45** «Жывы гук».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.10** «Героі «Мянтоўскіх войнаў».
**23.55 Маст. фільм «Памылкі следства».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.05, 19.35, 20.55, 0.05** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**7.25 Драма «Хаціка. Самы верны сябар».**
**9.00, 18.00 Серыял «Касл».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00, 19.35 Серыял «Крах».**
**12.10 Камедыя «У люстэрка два твары».**
**14.20 Серыял «Пустыня ў агні».**
**16.00** «Кінаблакнот».
**16.10** Мультпарад.
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Гімнасткі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Фантастыка «Хронікі Рыдзіка».**
**23.15 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».**

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Аманда О».**
**10.00** «Гардэроб навылет».
**11.00** «Дом без ахвяр».
**12.00, 20.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**13.00, 18.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 21.10 Серыял «Фізіка або хімія».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.30, 22.15** Навіны культуры.
**9.20 «Шчаслівыя прыгажэйшыя». Маст. фільм.**
**11.10, 1.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**11.30** «Правілы жыцця». Ток-шоу.
**11.55** «Пісьмы з правінцыі».
**12.25 «Баязет». Серыял.**
**14.10** Дакументальная камера. «Музыка і кіно: у пошуках месца сустрэчы».
**14.50** «Білет у Вялікі».
**15.30** «Ларыса Маляваная». Дак. фільм.
**16.05** Майстры фартэпіяннага майстэрства. Дзяніс Мацуеў.
**17.05** «Silentium».
**18.15, 0.55** «Шукальнікі». «Справа Салтычыхі».
**19.05 «Нерухомая навальніца». Маст. фільм.**
**20.30** «Лінія жыцця». Алена Бабенка.
**21.25** «Музейныя тайны». Дак. серыял.
**22.35 «Кухар, злодзей, яго жонка і яе палюбоўнік». Маст. фільм.**
**0.50** «І смех і грэх». М/ф для дарослых.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.05** «Пад знакам «Пі» «Шпіёнскія гісторыі». 1992 год.
**6.00** «Спявае вакальна-інструментальны ансамбль «Пламя». Фільм-канцэрт. 1978 год.
**6.30, 12.30 «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 20.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 16.00** «Песня-84».
**11.00** «Ельцын у Японіі». Тэлемост. 1992 год.
**11.55** «Ранішняя пошта» «Супярэчнасці». 1986 год.
**13.40** «Гандлёвы рад». 1991 год.
**17.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока».
**18.10** «20 хвілін з «Песнярамі». Фільм-канцэрт. 1980 год.
**18.35 «Ану, дзядулі!». Камедыя.**
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Кінапанарама». 1989 год.
**23.00** «Спяём, сябры!».
**0.25** «Што такое каратэ?». Дак. фільм.
**1.00** «Дзесяць дзён, якія ўсхвалявалі свет». Спектакль маскоўскага тэатра на Таганцы. 1987 год.
**4.00** «Музычны рынг». Групы «Бітлз рывайвел бэнд», «Рускія» і рок-спявак Эдгар Вінтэр. 1989 год.

### EUROSPORT

**8.00** Тэніс. Australian Open. Парны разрад. Фінал. Жанчыны.
**9.45, 11.30, 14.00, 22.00, 2.45** Тэніс. Australian Open.
**11.15, 20.15, 1.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**14.45, 20.45** Скіпас.
**15.00, 21.00, 1.30** Скачкі на лыжах. Кубак свету.
**16.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**17.45** Шары. Чэмпіянат свету.
**2.30** GTA. Наступны ўзровень.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 7.45, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Як не варта жыць».
**6.15** Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
**8.45** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**11.15** Камедыя «Другое Я».
**14.10** Камедыя «Старыя».
**17.20** Камедыя «Маленькі прыбытак бацькі».
**18.50, 23.50, 4.40** «Камедыянты. Лепшае».
**19.20** Камедыя «Усе выраслі».
**22.10** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**0.10** Камедыя «Дурням закон не пісаны».
**3.25** Меладрама «Ананімныя рамантыкі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.00, 14.45** «Доктар I..».
**9.30, 18.30, 4.10** «Цудоўнае стагоддзе. Стварэнне легенды». Фільм пра фільм.
**10.30, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.30, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.30, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.00** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял. Заключная серыя.
**13.50** «Дом уверх дном».
**15.15, 0.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**19.40** «Мы купілі заапарк». Маст. фільм.
**21.55** «Вялікі Лябоўскі». Маст. фільм.
**0.00** «Падмані мяне». Серыял.

### ТБ1000

**5.00, 13.10** Драма «Закаханыя».
**7.25, 19.20** Драма «Скарб».
**9.20** Баявік «Прывідны гончшык».
**11.30** Баявік «Прывідны гончшык 2».
**15.35** Трылер «Вогненная сцяна».
**17.25** Драма «Імператарскі клуб».
**21.20** Драма «Сем жыццяў».
**23.40** Драма «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
**2.10** Фантастыка «Вяртанне Супермена».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Меладрама «Васількі для Васілісы».
**8.00** М/ф «Карлік Нос».
**10.00** Камедыя «Заза».
**12.00** Драма «Год сабакі».
**14.25** Драма «Русалка».
**16.20** Камедыя «Рэальны тата».
**18.00** Драма «Рабінавы вальс».
**20.00** Камедыя «Спатканне».
**21.50** Камедыя «Ёлкі 2».
**23.50** Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
**1.40** Трылер «Рускі трохвугольнік».
**4.00** Трагікамедыя «Навобмацак».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Гісторыя небаскробаў.
**6.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**7.00** Прыручыць дракона.
**8.00, 12.00** Аферысты і турысты.
**10.00, 17.00** Мегазаводы.
**11.00** Старацелі.
**14.00** Загадкі каралеўскай кобры.
**15.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**18.00** Золата Юкана.
**19.00, 22.00** Дзясятка лепшых фота «Nat Geo».
**20.00, 0.00, 3.00** Страшэнны кадр.
**21.00, 1.00, 4.00** National Geographic: 125 дзіўных фота.
**23.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**7.00** У пагоні за класікай.
**7.50, 13.15** Хлопцы з Юкана.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Брудныя грошы.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Як уладкаваны Сусвет.
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.25** Эд Стафард: голае выжыванне.
**17.20, 3.05** Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
**18.15** Золата джунгляў.
**19.10** Залатая ліхаманка.
**21.00** Сістэма кіравання.
**22.00** Цуды Сусвету.
**23.00** Пераломны момант.
**0.00, 5.10** Навука магіі.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## СУБОТА, 25 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.55** Існасць.
**7.20 Камедыя «Цырк».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Зямельнае пытанне.
**9.35, 23.45 Серыял «Саша-Таня».**
**11.30** Тайны следства.
**12.10** Клуб рэдактараў.
**12.55** Здароўе.
**13.40** Журналісцкае расследаванне.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Без права на дубль». Андрэй Растоцкі.
**16.45** Давярай і правярай.
**17.15** Нашы.
**17.25 Камедыя «Дарагая, я павялічыў дзіця».**
**19.10 Меладрама «Вогнішча на снезе». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Трылер «Крумкач».**
**23.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.35 Фільм-казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».**
**9.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.55, 21.10** Тэлебарометр.
**10.00** Беларуская кухня.
**10.35 Фантастыка «Двухсотгадовы чалавек».**
**13.05** «Бітва экстрасэнсаў».
**14.10** Вышэй за дах.
**14.45 Меладрама «Я люблю праблемы».**
**17.05, 22.50 Серыял «Таксі».**
**18.05** Імперыя песні.
**19.10** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** «СуперІнтуіцыя. Каханне».
**21.05** КЕНО.
**21.15 Камедыя «Энцыклапедыя разводаў».**
**23.35** Хакей для ўсіх.
**0.20** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Атлант».

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 11.50, 16.50, 19.15, 0.25** «Калейдаскоп».
**8.10** «Прыстанак душы».
**8.35** «Кожны мае права быць розным».
**9.05 Дзіцячы фільм. «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя».**
**11.25** «Наперад у мінулае».
**12.00** «Вандроўкі пана Кандратовіча». Паэт Уладзімір Сыракомля.
**12.15** «Балада пра Свіцязь». Дак. фільм.
**12.40** «Гэты дзіўны свет. Чэслаў Немен». Дак. фільм.
**13.15** «Слуцкія паясы». Дак. фільм.
**13.50** «Купала і Колас. Два яблыкі на адной галінцы». Дак. фільм.
**14.15** «Карані».
**14.45** «Полацк». Дак. фільм.
**15.00** «Драўляны народ». Народны майстар Мікалай Тарасюк.
**15.30** «Лёс. Сяргей Лазніца». Дак. фільм.
**16.00** VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета. Канцэрт.
**16.55 «Капітан Нэма». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.50** Сусветнае кіно. «Бацька-гаспадар».
**22.40** «Давід Ойстрах, народны артыст?». Дак. фільм.
**0.00** «АРТіШОК».

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05, 16.20** Фактар сілы.
**8.35** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Матч за 5-е месца.
**10.05, 11.35** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. 1/2 фіналу.
**13.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва» (Мінск).
**15.00** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Эстафета. Мужчыны.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Атлант».
**19.15** Камандныя паядынкі па змяшаных адзінаборствах. Hip Show.
**19.45** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Эстафета. Жанчыны.
**21.05** Еўрапейскі покерны тур.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Чэлсі» — «Манчэстэр Юнайтэд».

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**11.55** «Разумніцы і разумнікі».
**12.40 Маст. фільм «Вертыкаль».**
**14.10** «Хвіліна славы. Дарога на Алімп».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20 Маст. фільм «Маленькія трагедыі. Каменны госць».**
**17.35** «Я спяваю!».
**21.05** Да дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».
**23.00 Маст. фільм «Дзесьці».**
**0.50 Маст. фільм «Свет Кормана».**

### СТБ

**6.30 «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.**
**8.00** «Анфас».
**8.15 Камедыя «Вампіркі».**
**10.00** «Іншая краіна». «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты: не нафтай адзінай».
**10.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40 Маст. фільм «Два капітаны».**
**14.30** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Дзіўная справа».
**18.40** «Разумней не прыдумаеш».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Баявік «Механік».**
**22.00** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Кактэйль» супраць «JEAN-CHRISTOPHE».
**23.15 Маст. фільм «Колькі ты каштуеш?».**
**0.55** «Глядзець усім!».

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Па сакрэце ўсяму свету».**
**7.10** М/ф.
**7.50** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**8.15** «Эксперыментатары».
**8.30** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Любімыя акцёры».
**9.35 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».**
**11.15 Маст. фільм «Калі зацвіце багун».**
**14.35, 22.15** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**15.10 Серыял «Амазонкі».**
**19.35** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
**20.15 Маст. фільм «Юлечка».**
**23.00** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Беларусь — Казахстан.
**0.35** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Кыргызстан — Таджыкістан.
**2.10 Маст. фільм «Сэрца маё — Астана».**
**4.10** «Нітка да ніткі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Гувернантка».**
**8.40 Маст. фільм «Злачынная страсць».**
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.25** М/ф.
**12.35 Маст. фільм «Дзе вы, рыцары?».**
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Хуліа Іглесіяс. Жыццё працягваецца».
**15.50** «Гарадок».
**16.50** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45 Маст. фільм «Незабудкі».**
**0.10** КВЗ. Лепшае.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.30 Серыял «Агент асобага назначэння».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Агляд».
**8.50** «Выратавальнікі».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20 Дэтэктыў «Іржа».**
**15.05** «ДНК». Ток-шоу.
**16.20** «Следства вялі...».
**17.10** «Вочная стаўка».
**18.05** «І зноў прывітанне!».
**19.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!».
**22.00 Маст. фільм «Воўчы востраў».**
**23.45 Маст. фільм «Вецер паўночны».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.10 ,18.50, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**10.25 Серыял «Крах».**
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.40 Камедыя «Марлі і я».**
**13.15 Баявік «Судны дзень. Тэрмінатар-2».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Фільм-дзецям. «Сабрына — маленькая ведзьма».**
**17.15 Серыял «Прыгажуня і пачвара».**
**18.55 Трылер «Шостае пачуццё».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Неверагодная магія».
**21.10 Драма «Палонніца».**
**22.55 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».**

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 15.00** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**10.30, 16.00, 0.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**11.00, 22.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**11.30, 17.00, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00** «Ежа па правілах і без».
**13.00 Камедыя «Жарты анёла»**
**17.45** «Уральскія пельмені».
**19.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**20.30 Баявік «Ідэальныя ўцёкі».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Біблейскі сюжэт.
**9.35 «Дарослыя дзеці». Маст. фільм.**
**10.50** Вялікая сям'я. Рыгор Остэр.
**11.45** Пернікавы домік. «Пад аховай анёлаў».
**12.10** «Маўглі». М/ф.
**13.50** Красуйся, горад Пятроў!
**14.20** Спектакль тэатра імя Массавета «Вяселле Крачынскага».
**16.55** «Танец воінаў племені вадаабе». Дак. фільм.
**17.50** «Рамантыка рамансa».
**18.45 «Жыве такі хлопец». Маст. фільм.**
**20.20** Барыс Грабеншчыкоў і група «Акварыум». Канцэрт у КЗЧ.
**21.55 Кіно на ўсе часы. «Паштоўкі з краю бездані». Маст. фільм.**
**23.45** «Джэм-5». Чык Карыа і Бобі Макферын.
**0.45** «Дару табе зорку». М/ф для дарослых.
**0.55** «Легенды сусветнага кіно». Георгій Юматаў.
**1.25** «Звычайны канцэрт».
**1.50** «Поль Гаген». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Ельцын у Японіі». Тэлемост. 1992 год.
**5.55** «Ранішняя пошта» «Супярэчнасці». 1986 год.
**6.30, 0.30 «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм.**
**7.40** «Гандлёвы рад». 1991 год.
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаны ў СССР».
**10.00, 4.00** «Песня-84».
**11.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока».
**12.10** «20 хвілін з «Песнярамі». Фільм-канцэрт. 1980 год.
**12.35** «Ану, дзядулі!». Камедыя.
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кінапанарама». 1989 год.
**17.00** The Best of «СевАлогія». 2007 год.
**17.55** «Тэледыскатэка». 1986 год.
**18.35** «Вакол смеху». 1983 год.
**20.00** «Шэсць песень на біс». Музычнае шоу. 1993 год.
**20.45** М/ф «Запіскі пірата». 1989 год.
**21.00 «The Beatles: Help!». Маст. фільм.**
**22.35** «Ваш кумір». Мікалай Озераў. 1995 год.
**23.00** «Пад знакам «Пі» «Шпіёнскія гісторыі». 1992 год.
**0.00** «Спявае вакальна-інструментальны ансамбль «Пламя». Фільм-канцэрт. 1978 год.

### EUROSPORT

**10.30, 22.15, 2.30** Тэніс. Australian Open.
**11.15, 20.15, 1.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**11.30, 19.30, 23.45** Тэніс. Australian Open. Фінал. Жанчыны.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**14.45, 16.00, 21.15** Скачкі на лыжах. Кубак свету.
**17.15** Дзюдо. Камандны турнір.
**18.00** Шары. Чэмпіянат свету.
**1.30** Байцоўскі клуб.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 12.55, 21.00** Камедыя «Вандроўнік».
**5.45, 13.30, 21.30** Камедыя «Пажарны».
**6.15** Камедыя «Другое Я».
**7.45, 12.40, 13.50, 15.45, 21.50, 23.40** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 16.00, 2.25** Камедыя «Накаўт».
**8.30, 16.30, 2.55** Камедыя «Банк».
**9.00** Камедыя «Старыя».
**11.15** Камедыя «Маленькі прыбытак бацькі».
**14.10** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**17.20** Камедыя «Усе выраслі».
**19.20** Камедыя «Дзякуй, тата, дзякуй, мама».
**22.10** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
**23.55** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**3.25** Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.40** «Сябры». Серыял.
**10.55** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**11.45, 15.15, 1.40** «Сэрцы трох». Маст. фільм.
**14.45** «Тайны нашага кіно. «Сэрцы трох».
**17.15** «Сіндром зомбі. Чалавек кіраваны». Спецыяльны рэпартаж.
**18.15** «Куды прыводзяць мары». Маст. фільм.
**20.30** «Калі б я цябе кахаў». Маст. фільм.
**22.30** «Не злоўлены — не злодзей». Маст. фільм.
**0.50** «Падмані мяне». Серыял.

### ТБ1000

**5.00** Трылер «Вогненная сцяна».
**7.00** Маст. фільм «Аксана ў краіне цудаў».
**9.00** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**11.00** М/ф «Труп нявесты».
**13.00** Драма «Сем жыццяў».
**15.30** Фантастыка «Вяртанне Супермена».
**18.30** Трылер «Зыходны код».
**20.10** Камедыя «Патрыманыя львы».
**22.30** Драма «Каханне».
**1.00** Трагікамедыя «Вундэркінды».
**3.00** Камедыя «Слава».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.30** Камедыя «Свята Нептуна».
**8.00** Драма «Рабінавы вальс».
**10.00** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**12.00** Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
**14.40** Камедыя «Ёлкі 2».
**16.30** Камедыя «Скарбы О.К.»
**18.30** Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
**20.00** Драма «Дом».
**22.20** Меладрама «8 першых спатканняў».
**0.00** Трагікамедыя «Навобмацак».
**2.10** Камедыя «Свята пад замком».
**4.00** Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 13.00** Замбезі: Крыніца жыцця.
**6.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**8.00** Дзікі тунец.
**9.00** Золата Юкана.
**10.00** Золата горада-прывіда.
**11.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**12.00** Апакаліпсіс: узыходжанне Гітлера.
**14.00** Выратаваны львіцай.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Страшэнны кадр.
**17.00** National Geographic: 125 дзіўных фота.
**18.00** Дзясятка лепшых фота «Nat Geo».
**19.00** Першай справай — самалёты.
**20.00, 23.00, 2.00** Расследаванні авіякатастроф.
**21.00, 1.00, 4.00** Жах у небёсах.
**22.00** Сведкі японскай катастрофы.

### DISCOVERY

**7.00** Як гэта ўстроена?
**7.25, 13.40** Хуткія і гучныя.
**8.15, 19.10** Эд Стафард: як выжыць на бязлюдным востраве.
**9.10, 2.40** Хлопцы з Юкана.
**10.05, 3.30** Золата джунгляў.
**11.00, 6.05** Багажныя войны.
**11.50** Шукальнікі скарбаў Амерыкі 2.
**12.45, 5.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.35** У пагоні за класікай.
**15.30** Махінатары: пяцёрка лепшых.
**16.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**17.20** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**18.15** Залатая ліхаманка.
**20.05** Беар Грылс: кадры выратавання.
**21.00** Зброя, якая змяніла свет.
**22.00** Я ўцёк.
**23.00** Імперыя па-за законам.
**0.00** Пераломны момант.
**0.55** Сістэма кіравання.
**1.50** Цуды Сусвету.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**4.45** Як гэта зроблена?

## НЯДЗЕЛЯ, 26 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25 Камедыя «Афоня».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.35, 0.05 Серыял «Саша-Таня».**
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.10** Каробка перадач.
**13.45** «XXL WOMAN TV».
**14.25** Урачэбныя тайны.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**16.00** «Зорнае жыццё». «Пераадолей свой страх».
**17.05** Давярай і правярай.
**17.35 Меладрама «Любоўны пераплёт».**
**19.10 Меладрама «Вогнішча на снезе». Заключная серыя.**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55 Драма «Незнаёмка».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.30 Фільм-казка «На залатым ганку сядзелі».**
**8.40** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.35** Тэлебарометр.
**9.40** Заўтра — гэта мы!
**10.05 Камедыя «Энцыклапедыя разводаў».**
**11.50** «Аўтабатл».
**12.25** Футбол. Чэмпіянат свету-2014. Відэачасопіс.
**12.55 Трагікамедыя «Кур'ер».**
**14.35** «СуперІнтуіцыя. Каханне».
**15.45, 23.50 Серыял «Таксі».**
**16.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
**18.35** Суперлато.
**19.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Фінал.
**21.05** Спортлато 5 з 36.
**21.10** КЕНО.
**21.15** Навіны надвор'я.
**21.50 Меладрама «Кошкі-мышкі».**
**0.45** «Comedy woman».

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 10.55, 13.25, 23.15** «Калейдаскоп».
**8.10** «Таямніца душы».
**8.35** «Кожны мае права быць розным».
**9.00** «АРТіШОК».
**9.30** «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Беларускія карані Уладзіміра Высоцкага.
**10.00** «Добры дзень, мае дарагія!». Франтавая перапіска Сяргея Пятровіча Каткова — мастака-педагога.
**10.30** «Карані».
**11.05 «Капітан Нэма». Маст. фільм.**
**14.40** «Давід Ойстрах, народны артыст?». Дак. фільм.
**16.00 Дзіцячы фільм. «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя».**
**18.10, 22.50** «Культпрасвет».
**18.40** Сусветнае кіно. «Бацька-гаспадар».
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Народная артыстка». Творчы вечар народнай артысткі Беларусі Таццяны Мархель.
**21.50 «Незнаёмая песня». Маст. фільм.**
**22.20 «Барвовая трава». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.00** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Эстафета. Мужчыны.
**9.30** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Атлант».
**11.20** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Эстафета. Жанчыны.
**12.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Хімік-СКА».
**15.15** Камандныя паядынкі па змяшаных адзінаборствах. Hip Show.
**15.45** Баскетбол. Кубак выклiку. «Цмокі-Мінск» — «Урал» (Расія).
**17.20** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). Фінал.
**19.35** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
**20.30** Футбол. Чэмпіянат свету-2014. Відэачасопіс.
**21.00** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Матч за 3-е месца.
**22.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.45** «Фазэнда».
**11.20** «Вясельны пярэпалах».
**12.10 Камедыя «Волга-Волга».**
**14.10 Камедыя «Верныя сябры».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Пра старое добрае кіно».
**17.20** «Рассмяшы коміка».
**18.20** «Новы год».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Кубак прафесіяналаў».
**0.00 Маст. фільм «Пра каханне».**

### СТБ

**6.15 «Чатыры танкісты і сабака». Серыял.**
**8.15 Баявік «Механік».**
**10.00** «Аўтапанарама».
**10.30** «Тайны свету».
**11.30** «Вялікае снеданне».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45 Камедыя «Ёлкі-палкі!..».**
**14.25** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Чалавек-нефармат, або 6:5 на карысць Задорнава».
**17.50** «Аўтапанарама».
**18.20** «На тым жа месцы ў той жа час».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Мінулай восенню ў Нью-Ёрку».**
**22.25** «Прафесійны бокс».
**23.40 Драма «З шырока заплюшчанымі вачыма».**

### МІР

**5.00** М/ф.
**6.25 Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».**
**8.05** «Ведаем рускую».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Зямля і неба».
**9.35** «Нітка да ніткі».
**10.00** «Прыгоды Македонскай».
**10.10 Маст. фільм «Танцуй, танцуй».**
**12.45** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**15.10, 21.00 Серыял «Я вярнуся».**
**20.00** «Разам».
**0.10** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Беларусь — Латвія.
**1.45** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Казахстан — Узбекістан.
**3.20** Кубак Садружнасці-2014. Групавы этап. Літва — Расія.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Незабудкі».**
**10.10** «Сам сабе рэжысёр».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**11.45** «У свеце жывёл».
**12.20** «Ха». Маленькія камедыі.
**12.40 Маст. фільм «Вальс».**
**14.15** «Пакой смеху».
**14.50 Маст. фільм «Майскі дождж».**
**16.35 Маст. фільм «Букет».**
**18.25** «Смяяцца дазваляецца».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.25 Маст. фільм «Пад прыцэлам кахання».**
**23.40** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Агент асобага назначэння».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Медыцынскія тайны».
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.25** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Цуд тэхнікі».
**12.30** «Першая перадача».
**13.20 Дэтэктыў «Іржа».**
**15.05** «Лепшы горад Зямлі».
**16.20** «Следства вялі...».
**17.10** «Вочная стаўка».
**18.05** «І зноў прывітанне!».
**18.25** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.50 Дэтэктыў «Мсціўца».**
**23.20** «Споведзь».
**0.20** «Школа зласлоўя».

### 8 КАНАЛ

**9.00,13.00, 18.50, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 «Сінематограф». Маст. фільм «Сірэна Місісіпі».**
**13.05 Трылер «Шостае пачуццё».**
**15.00** «Сёння клюе».
**15.30 Серыял «Камісар Рэкс».**
**17.15** Ток-шоу «Бульбокс».
**17.45 Серыял «Лэдзі дэтэктыў».**
**18.55 Баявік «Цёмная тэрыторыя».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Камедыя «Прыкінься маёй жонкай».**
**23.00 Серыял «Спартак. Кроў і пясок».**

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**10.30, 0.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**11.00, 14.30, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**11.30, 18.30, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00** «Дом мары».
**12.30** «Астралогія кахання».
**13.30** «Шчасце без ахвяр».
**15.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**16.30 Баявік «Ідэальныя ўцёкі».**
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.30 Баявік «Атрад асобага прызначэння».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** «Звычайны канцэрт».
**9.35 «Добрай раніцы». Маст. фільм.**
**11.05** «Легенды сусветнага кіно». Фрэд Астэр.
**11.30** «Расія, любоў мая!».
**12.00** «Марыя, Мірабела». «Падарожжа мурашкі». М/ф.
**13.15** «Што рабіць?».
**14.00** Барыс Грабеншчыкоў і група «Акварыум». Канцэрт у КЗЧ.
**15.30** «Хто там...».
**16.00** Мы і яны. «Ненет». Дак. фільм.
**17.00** «Кантэкст».
**17.40** «Масфільм». 90 крокаў».
**17.55 «Раба кахання». Маст. фільм.**
**19.25** «У гонар Алісы Фрэйндліх». Творчы вечар.
**20.55** «Іншыя берагі». Дак. фільм.
**21.35** Балет Джорджа Баланчына «Каштоўнасці».
**23.25 «Дарослыя дзеці». Маст. фільм.**
**0.35** «Як адзін мужык двух генералаў пракарміў». М/ф для дарослых.
**0.55** «Шукальнікі». «Дзе знаходзіцца радзіма Залатога руна?».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока».
**6.10** «20 хвілін з «Песнярамі». Фільм-канцэрт. 1980 год.
**6.35 «Ану, дзядулі!». Камедыя.**
**8.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». 1989 год.
**11.00** The Best of «СевАлогія». 2007 год.
**11.55** «Тэледыскатэка». 1986 год.
**12.35** «Вакол смеху». 1983 год.
**14.00** «Шэсць песень на біс». Музычнае шоу. 1993 год.
**14.45** М/ф «Запіскі пірата». 1989 год.
**15.00 «The Beatles: Help!». Маст. фільм.**
**16.35** «Ваш кумір». Мікалай Озераў. 1995 год.
**17.00** «Не оставляй меня, любовь». Юбілейная праграма Валянціны Талкуновай. 1992 год.
**18.00, 3.00** «Народжаны ў СССР».
**19.00** «Масква — Космас — Каліфорнія». Тэлемост. 1983 год.
**20.00** «Кальвар-шоу». Музычная праграма. 1992 год.
**20.45** М/ф «Пра Мацвея Кузьміча». 1990 год.
**21.00** «Што? Дзе? Калі?». 1991 год.
**22.05** «З Месяца зваліўся». Тэлеспектакль паводле апавяданняў М. Зошчанкі. 1988 год.
**23.00** «Ельцын у Японіі». Тэлемост. 1992 год.
**23.55** «Ранішняя пошта» «Супярэчнасці». 1986 год.
**0.30 «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм.**
**1.40** «Гандлёвы рад». 1991 год.
**4.00** «Песня-84».

### EUROSPORT

**9.00** Тэніс. Australian Open. Мікст. Фінал.
**10.45** Тэніс. Australian Open. Фінал. Жанчыны.
**11.15, 21.00, 1.15** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**11.30, 19.30, 23.45, 2.35** Тэніс. Australian Open. Фінал. Мужчыны.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**16.15** Лыжнае двуаборʼе. Кубак свету.
**17.15, 2.30** Зімовы ўік-энд.
**17.20** Шары. Чэмпіянат свету.
**17.30** Шары. Чэмпіянат свету. Фінал.
**21.15** Вось гэта дзіва!!!
**21.30** Конны спорт. Кубак свету.
**22.30, 1.30** Скачкі на лыжах. Кубак свету.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 12.55, 21.00** Камедыя «Накаўт».
**5.45, 13.30, 21.30** Камедыя «Банк».
**6.15** Камедыя «Маленькі прыбытак бацькі».
**7.40** Камедыя «Чарлі на вясёлым мерапрыемстве, або Пярэпалах на танцпляцоўцы».
**8.00, 16.00, 2.25** Камедыя «Вандроўнік».
**8.30, 16.30, 2.55** Камедыя «Пажарны».
**9.00** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**10.40, 13.55, 15.45, 21.55** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Камедыя «Усе выраслі».
**14.10** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
**17.20** Камедыя «Дзякуй, тата, дзякуй, мама».
**19.20** Камедыя «Скажы так».
**22.10** Камедыя «Жаніх вяртаецца».
**0.10** Камедыя «Старыя».
**3.25** Камедыя «Другое Я».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.30** «Сябры». Серыял.
**10.50** «Паненка і кулінар».
**11.20, 4.05** «Управа». Серыял.
**13.30** «Жонка. Гісторыя кахання». Дзіяна Гурцкая.
**14.50** «Сто пытанняў даросламу». Ларыса Доліна.
**15.40, 1.15** «Бомба для нявесты». Маст. фільм.
**19.00** «Шакал». Маст. фільм.
**21.20** «Любоўная ліхаманка». Маст. фільм.
**23.30** «Часова даступны». Любоў Казарноўская.
**0.30** «Падмані мяне». Серыял.

### ТБ1000

**5.00** Маст. фільм «Аксана ў краіне цудаў».
**7.00** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**9.00** М/ф «Труп нявесты».
**11.00** Трылер «Зыходны код».
**12.45** Камедыя «Патрыманыя львы».
**15.00** Трагікамедыя «Вундэркінды».
**17.00** Драма «Каханне».
**19.15** Драма «Залаты век».
**21.15** Трылер «Пералом».
**23.15** Камедыя «Слава».
**1.15** Меладрама «Мае чарнічныя ночы».
**3.00** Камедыя «Міс Пецігру».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
**8.50** Маст. фільм «Стрэлы Робін Гуда».
**10.30** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**12.00** Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».
**13.20** Камедыя «Свята пад замком».
**14.50** Меладрама «8 першых спатканняў».
**16.30** Драма «Князёўна Мэры».
**18.30** Камедыя «Са мною вось што адбываецца».
**20.00** Меладрама «Будзь са мной».
**21.30** Меладрама «Гувернантка».
**23.40** Трылер «Рускі трохвугольнік».
**2.00** Драма «Год сабакі».
**4.30** Камедыя «Свята Нептуна».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 13.00** Напад каётаў.
**6.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**8.00** Дзікі тунец.
**9.00** Золата Юкана.
**10.00** Золата горада-прывіда.
**11.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**12.00** Апакаліпсіс: узыходжанне Гітлера.
**14.00** Няўлоўная котка.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**19.00** Амерыканскае зацямненне.
**20.00, 23.00, 2.00** Экстрэмальныя хобі.
**21.00, 0.00, 3.00** Planet XXL.
**22.00, 1.00, 4.00** Неверагодна маленькі свет.

### DISCOVERY

**7.00, 8.40** Як гэта ўстроена?
**7.25** Паляўнічыя на рэліквіі.
**8.15, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.10, 16.25, 18.15** Беар Грылс: кадры выратавання.
**10.05, 22.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**11.00, 21.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**11.50** Сістэма кіравання.
**12.45** Пераломны момант.
**13.40** Цуды Сусвету.
**14.35** Залатая ліхаманка.
**19.10** НФЛ: Тачдаўн на стадыёне Уэмблі.
**20.05, 3.30** Разбуральнікі легенд.
**23.00, 2.40** Пошук прышэльцаў.
**0.00** Зброя, якая змяніла свет.
**0.55** Імперыя па-за законам.
**1.50** Я ўцёк.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** У пагоні за класікай.
**6.05** Махінатары: пяцёрка лепшых.

# ГАЛОПАМ ПА ЕЎРОПЕ,
## або Бог у дэталях, д'ябал у дробязях

**Так і не змагла дакладна высветліць, хто аўтар гэтага вядомага выразу. Ці то Гётэ, ці то Флабэр — абодва пераасэнсоўвалі заходнееўрапейскі фальклор. Аднак менавіта такое выказванне прыходзіла ў галаву на працягу апошніх тыдняў. У канцы 2013 — пачатку 2014-га давялося вандраваць на аўтобусе па некалькіх еўрапейскіх краінах. Але паколькі па Еўропе мы, хутчэй, «ляцелі», чым ехалі, то і ўражанні аказаліся вельмі рознымі. Што ў вачах адлюстравалася, калі перасякалі межы Польшчы, Германіі, Францыі, Італіі, Аўстрыі, Чэхіі і зноў жа Польшчы, — тое і ўзгадаю.**

Ацаніць прыгажосць наваколля ў бліжэйшай на захад суседняй краіне не далі бясконцыя вялізныя шчыты ўздоўж дарогі. Як высветлілася, усталяваныя перш-наперш дзеля таго, каб у населеных пунктах менш былі чуваць гукі ад трасы. Але ж не толькі. Чаго глядзець на чужую прыватную ўласнасць, якая, да таго ж, абсалютна паўсюдна абнесена яшчэ і сеткай-агароджай? Так што ніякіх даляглядаў, ніякай перспектывы, ніякіх прывычных чорна-белых каровак за акном.

Больш за тое: ніякай магчымасці прывычным для нас чынам задаволіць натуральныя патрэбы. Усё трымай у сабе ажно да афіцыйнага прыпынку. А гэта — раз на 3,5–4 гадзіны. Звычайна пры запраўцы аўтобуса палівам ці ў спецыяльна адведзеным месцы, дзе ёсць невялічкія ўтульныя крама-бар-атэль ну і, вядома ж, прыбіральня пры іх. Адно наведванне «ўтульнага кутка» звычайна каштуе каля 0,5 еўра. Пры гэтым далёка не паўсюль у вышэйназваных краінах прыбіральні платныя. Прасачыць логіку, згодна з якой можна было б вызначыць, трэба рыхтаваць грошы ці не, ніяк не атрымалася. Але ні разу, нідзе, ні з-за якіх падстаў нікога з нас не прымусілі доўга шукаць месца, каб адасобіцца. Пры гэтым і туалетная папера таксама ніколі не заканчвалася.

Кансерватыўны і строгі Берлін, на наведванне якога было адведзена менш за суткі, уразіў будаўніцтвам, якое вядзецца асабліва ва ўсходняй яго частцы. Камунікацыі выведзены вонкі, і таму горад на Шпрэе нагадвае будаўнічую пляцоўку, хоць і вельмі акуратную. Самы галоўны для былых савецкіх людзей сімвал — рэйхстаг — хоць і не закрыты для наведвання, але ўваход у яго абмежаваны і патрабуе папярэдняй замовы. Прачытаць тыя самыя надпісы, якія сведчаць пра перамогу нашых продкаў у Вялікай Айчыннай, нам не давялося. Наша руская


Дзіцячая горка для катання.

па паходжанні экскурсавод, якая сваё бліскучае пачуццё гумару падтрымлівае за кошт стасункаў з былымі суайчыннікамі, адзначыла, што занатаваныя на камені выразы ўнутры будынка-сімвала далёка не заўсёды можна вымаўляць пры дзецях. Нашы продкі шчыра выказвалі эмоцыі — пісалі вобразна пра тое, што адчувалі.

Берлінскую сцяну мы пабачылі… пад коламі свайго аўтобуса. Ён некалькі разоў перасякаў выкладзеную брукам у асфальце сімвалічную паласу, якая некалі нажывую прарэзала горад і народ. Даволі нечакана было тут жа, на зліцці дзвюх частак Берліна, пабачыць вялізную адкрытую штучную снежную горку для катання.

Імя злога генія XX стагоддзя тут імкнуцца нават не казаць услых без падставы, а вось «жалезнага канцлера і хітрую лісу» Бісмарка ўспамінаюць з гонарам. Дарэчы, некалькі разоў экскурсавод падкрэсліла, што апошнім часам значна знізіліся прыбыткі жыхароў краіны «і кожны сёмы апынуўся за рысай беднасці». Праўда, у лічбах яна тую рысу так і не вызначыла, колькі мы яе ні пыталі. Пра парадоксы сацыяльнай медыцыны пры наяўнасці страхоўкі адазвалася адназначна: «Сацыяльна — гэта не значыць, што цябе будуць добра лячыць». Але ж запэўніла, што калі мясцоваму грамадзяніну Германіі без вызначанага месца жыхарства спатрэбіцца аперацыя на сэрцы, яе яму зробяць — пасля чаго вернуць на тую ж лаўку ў парку, дзе ён ляжаў дагэтуль.

Між іншым, тыя ж беспрацоўныя маюць права бясплатна наведваць музеі і выставачныя залы — каб павышаць свой культурны ўзровень і натхняцца высокім мастацтвам. Увогуле, у гэтай галіне ва ўсіх краінах Еўрасаюза яшчэ шмат розных бонусаў для моладзі, пажылых і інвалідаў. І ўсе гэтымі магчымасцямі карыстаюцца вельмі актыўна. Больш за тое — у вялікіх музеях, такіх, як Луўр, прадугледжана спецыяльнае невялікае памяшканне і столік, каб было зручна спавіваць дзіця. І таму зусім нікога не здзіўляе, калі маці з немаўляткам на руках ці ў вазку гуляе па выставачных залах.

Прынамсі, ёсць і такая акалічнасць. У былым палацы французскіх каралёў натоўп абавязкова вынесе вас да Джаконды і вы, вядома ж, паспрабуеце сфатаграфаваць сябе на фоне шэдэўра. Звярніце ўвагу таксама і на немаленькага памеру чорна-чырвоныя малюнкі з абодвух бакоў ад сусветна вядомай карціны.


Сачыце за сумкамі і кішэнямі каля Джаконды.

Яны заўважна папярэджваюць аб небяспецы магчымага крадзяжу: «Сачыце за сваімі сумкамі і кішэнямі, калі фатаграфуеце!». Відаць, маюць рацыю. У нас, на шчасце, абышлося без сумных інцыдэнтаў.

Дарэчы, распранацца ў Луўры зусім неабавязкова, а фатаграфаваць можна ўсё, што вам падабаецца. У іншых музеях, між тым, ёсць пэўныя абмежаванні. У галерэі д'Арсэ (Musee d'Orsay), дзе сабрана вялізная калекцыя твораў імпрэсіяністаў, фатаграфаваць забаронена ўвогуле, у іншых музеях — можна толькі без успышкі. Ідэаграфічнай інфармацыі паўсюль дастаткова — калі мовы не ведаеце, сачыце за малюнкамі на дзвярах.

Культуру вам прапануюць не толькі пабачыць, але і набыць — на любы густ і кошт. Крамы з мастацкімі альбомамі, сумкамі, кубкамі, алоўкамі, упрыгажэннямі і, безумоўна, магнікамі ў асартыменце ёсць у кожнай установе. Такім чынам вы абавязкова спакусіцеся на Мону Лізу, якая будзе потым загадкава і з дакорам назіраць з халадзільніка за вашым харчаваннем.

Выбар дробязяў на падарункі эканом-класа прапануюць і маладыя цемнаскурыя хлопцы — на ўсіх распаўсюджаных турыстычных маршрутах, асабліва ў Францыі. Яны кідаюцца на дзверы аўтобуса, як на амбразуру, працягваючы да вас чорныя рукі з нанізанымі на дрот маленькімі Эйфелевымі вежамі і крычаць: «Братаны, халява за 5 еўра!» Памятаю, калісьці з такім жа энтузіязмам накідваліся на пасажыраў цягнікоў прадаўцы цацак у Жлобіне. Між тым, за вызначаную суму вам могуць прадаць і адну вежачку-бірульку, і дзесяць. Як пойдзе гандаль, дзе працэс важней за вынік.

Паколькі ў цэнтры вялізнага горада абмежаваны месцы для стаянкі аўтобусаў, хадзіць прыйшлося даволі многа, заўважаючы па дарозе не толькі гістарычныя славутасці, але і адметнасці звычайнага жыцця, у тым ліку тых, каго яшчэ гадоў 20 таму наўрад ці можна было назваць сапраўднымі французамі. Дык вось, шлях да Луўра праз грамадскі парк Цюільры (le jardin des Tuileries) практычна наводнены прадаўцамі ўсяго таго, што мільгаціць, ззяе, прываблівае, а потым выкідаецца як непатрэбнае. Для самых гаспадарлівых — хусткі ці капялюшыкі з адпаведнай сімволікай. (А як жа вы потым успомніце, што былі ў Парыжы, калі не кінеце позірк на сумніўнай якасці рэч?)

Продаж ідзе непасрэдна з зямлі. Памятаю, у пачатку 1990-х так гандлявалі ў Гомелі салам і каўбасой жыхары Украіны, якія зараблялі на розніцы ў цэнах. Між тым, час ад часу, як і ў нас, іх там ганяюць паліцэйскія. Так што лёгкім жыццё новых французаў ніяк не назавеш.

А вось каталіцкае Раство ў Парыжы выклікала ў мяне вельмі супрацьлеглыя пачуцці. Але ж пра гэта раскажу асобна — у наступным матэрыяле.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**


Продаж сувеніраў ідзе непасрэдна з зямлі.


У Луўры каля скульптуры святой Марыі Магдаліны (G. Erhart).

■ На кантролі

# Яно было, «адно акно»?

**Спецыялісты ўпраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва Гомельскага гарвыканкама прымушаюць збіраць лішнія даведкі і перакладаюць свае абавязкі на грамадзян. Праведзеная камітэтам Дзяржкантролю Гомельскай вобласці праверка паказала, што нясвоечасова выконваюцца практычна ўсе працэдуры.**

У многіх выпадках час на разгляд заяў перавышае вызначаныя тэрміны больш чым на 200 дзён. Пры тым, што тэрмін ажыццяўлення саміх працэдур складае не больш за 30 дзён. Састарэла і тая інфармацыя для грамадзян, якая знаходзіцца на адпаведных стэндах. Ва ўпраўленні архітэктуры і горадабудаўніцтва склалася негатыўная практыка збору заяўнікамі дакументаў і звестак, якія павінны запытвацца кіраўніцтвам самастойна, а таксама патрабаванне дакументаў, не прадугледжаных заканадаўствам для ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, адзначылі ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю.

Напрыклад, па адміністрацыйнай працэдуры «Выдача дазвольнай дакументацыі на праектаванне, узвядзенне, рэканструкцыю, рэстаўрацыю, капітальны рамонт, добраўпарадкаванне аб'екта, знос» з заяўнікаў неабгрунтавана патрабуюць: копіі дакументаў на зямельны ўчастак і на аб'ект нерухомай маёмасці, дагавор арэнды капітальнага будынка (ізаляванага памяшкання), заключэнне на праектаванне аб'екта, выдадзенае Гарадскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі, пералік відаў работ на стадыі праектавання, схему знаходжання аб'екта ў маштабе 1:500, эскіз аб'екта, які праектуецца, рэканструюецца, мадэрнізуецца.

І гэта ў той час, калі, у адпаведнасці з адзіным пералікам адміністрацыйных працэдур, якія здзяйсняюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў дачыненні да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17.02.2012 № 156, для ажыццяўлення такой працэдуры заяўніку неабходна прадставіць толькі заяву; дакумент, які пацвярджае дзяржаўную рэгістрацыю юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка, і дакумент, што пацвярджае ўнясенне платы.

Кантралёры выявілі выпадкі і калі за дзяржрэгістрацыю самавольных пабудоў з грамадзян неабгрунтавана ўзялі 16,7 млн рублёў. Цяпер разглядаецца пытанне пра прыцягненне вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА



**Сёння з раніцы не жарты:**
**Снег напаў знянацку, ноччу.**
**Людзі могуць выйсці з хаты,**
**Калі гурбы пераскочаць.**

**Трактары ідуць брыгадай,**
**Батальёнам — снегамёты.**
**Камунальныя атрады**
**Наступаюць на сумёты.**

**Хлопцы з «мазаўскіх» кабінак**
**Рэжуць снежныя заносы,**
**Але зноў мільён сняжынак**
**Дэсантуецца з нябёсаў...**

**Я на гэтым полі бою —**
**У палоне. Шчыміць сэрца:**
**Як убачыцца з табою,**
**Ад вачэй тваіх сагрэцца?**

### Іншаземец перадаў аўто незаконна

У Віцебску канфіскаваны «Опель», зарэгістраваны ў Латвіі, на якім незаконна ездзіў грамадзянін нашай краіны. Асабістая машына была перададзена грамадзянінам Латвійскай Рэспублікі нашаму земляку ў парушэнне патрабаванняў мытнага кодэкса МС. «Опель» ацэначным коштам 74 мільёны рублёў канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

# НАШАМУ АЎТАРУ — 50!

Віктар Шульга *(на фота)* мае дыплом інжынера пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, зараз працуе ў адным з магазінаў Мінска сістэмы «Еўраопт». А ў



вольны час займаецца шашачнай кампазіцыяй, якой захапіўся яшчэ ў школьныя гады. Цяпер ён — неаднаразовы чэмпіён Беларусі, а ў раздзеле па стварэнні малых камбінацыйных праблем на вялікай стаклетачнай дошцы — бронзавы прызёр чэмпіянату свету, за што першым з беларускіх складальнікаў атрымаў званне міжнароднага майстра. Праявіў свае здольнасці ў арганізацыі спаборніцтваў рознага значэння і прапагандзе старадаўняй гульні. Напрыклад, па яго ініцыятыве праведзены прэстыжныя міжнародныя конкурсы «Беларусь-2012» і «Беларусь-2013». З улікам гэтых і іншых заслуг яму даверана кіраўніцтва камісіяй па кампазіцыі ФМЖД.

Нядаўна Віктар Іванавіч адзначыў сваё 50-годдзе! Віншуючы юбіляра, працягваем яго **аўтарскі конкурс-18** чарговымі заданнямі. У іх белыя пачынаюць і выйграюць:



№ 18/14. **Белыя:** b6, d6, f4, дамкі e1, h2 (5).

**Чорныя:** a5, b4, d4, e5, дамкі b8, d8 (6).

№ 18/15. **Белыя:** a1, a7, c3, c5, d4, e1, e5 (7).

**Чорныя:** a5, b2, c7, e7, f6, g5, g7 (7).

№ 18/16. **Белыя:** a3, a5, c3, c5, d2, d6, e5, g1 (8).

**Чорныя:** a7, b4, b8, c7, d8, f4, g3, g5 (8).



№ 18/17. **Белыя:** 7, 11, 33, дамка 3 (4).

**Чорныя:** 6, 27, 35, 39, 44, 45 (6).

❍❍❍

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### ПЕРШЫНСТВО КРАІНЫ

Яно прайшло ў першай лізе па шашках-64. Званне чэмпіёна заваяваў кандыдат у майстры спорту Аляксандр Барташ з Маладзечна. У мужчынскім турніры выступіла міжнародны майстар сярод жанчын Дар'я Федаровіч (Мінск). Гуляла яна моцна і эфектыўна: ёй уручаны сярэбраны медаль. 3-5 месца падзялілі майстры Віталь Аніська (Мінск), Васіль Навумік (Ваўкавыск) і мінчанін Уладзіслаў Валюк. Усе яны перайшлі ў вышэйшую лігу. У жанчын адбыўся розыгрыш 4 пуцёвак у вышэйшую лігу. Іх уладальніцамі сталі сталічныя кандыдаты ў майстры Марыя Міронава, Аляксандра Спірына, Паліна Петрусёва і Ганна Вузлік.

### РАШЭННІ

**«Аўтарскі-17»** (П. Шклудаў): **№ 17/18** — h8+, № 17/19 — h8 (c3A) a1 (d4) a5 (b2) c3, f4 (c3) c1+. A(f6) d8(b2) d6, a1+ і **№ 17/20** — c5, c7, g3, h8, f6, b4, c7, c7 (b6) a5 (e7) b6 (d6) a7 (e5) b8 (d4) f4(c3) c1+.




*Сам сябе не пахвалі — так і памрэш…*

*«Рубрыка «Алё, народ на провадзе!» за свае 13 гадоў стала па-сапраўднаму народнай. Цяжка нават уявіць, колькі змешчана ў ёй вясёлых і праўдзівых гісторый, — усклікае спадар Аляксандр Матошка з Расоншчыны. — Мяне асабіста заўжды ўражвалі аповеды аб жыцці чалавека, грамадства, дзяржавы, аб тых перагібах, якія дапускаліся як высокім кіраўніцтвам, так і не вельмі». Матэрыялы з рубрык «Простая мова», «Хто каго?», «Алё, народ на провадзе!» не маюць часу даўнасці. Таму я заўсёды выразаю іх з газет, захоўваю ў асобных папках, а потым падшываю. Такім чынам, — піша спадар Уладзіслаў Пілячынскі з вёскі Свіркі Докшыцкага раёна, — у мяне атрымаліся тры вялікія кніжкі, якія часта перачытваю сам і якія будуць чытаць і перачытваць мае нашчадкі…».*

*Што дадаць да гэтых і іншых прызнанняў? Хіба словы Расула Гамзатава, нагаданыя сужэнцамі Ясевічамі з Ляхавічаў: «Для таго, каб пазнаць сябе, патрэбна кніга. Для таго, каб пазнаць іншых, патрэбна кніга. Народ без кнігі падобны да чалавека, які крочыць з завязанымі вачыма: ён не бачыць свету. Народ без кнігі падобны на чалавека без люстэрка: яму нельга ўбачыць свой твар».*

*Мы — разам — гэтую кнігу пішам. Такім чынам…*

## ПАКАЯННЕ

Колькі снягоў растала, колькі вады сцякло, а помніцца да драбніц.

Пачатак 1956-га, студзень, заўтра — Каляды. Сяброўка мая, Ніна, кажа: «Слухай, а давай махнём дадому!». Я ёй тут жа: «Давай…». Бо дома ж — свята! Мама, пакуль малыя спяць (апроч мяне, іх чацвёра), будзе самаробнымі цацкамі і свежымі (з печы) абараначкамі ўпрыгожваць ялінку, будзе пячы пірагі…

Карацей, сабраліся мы і — не, каб сказаць што класнай, не, каб адпрасіцца, — сваім адумам паехалі дамоў, у вёску.

Прапусцілі два дні заняткаў, вярнуліся. Ідзе ўрок хіміі. Выкладчыца, яна ж дырэктар вучылішча Марыя Мікітаўна, выклікае мяне да дошкі і ставіць двойку, хоць на ўсе пытанні я адказала… Потым мяне выклікаюць на педсавет. Пытаюць, чаму я прапусціла заняткі. Маўчу, як той партызан, бо хіба ж скажаш (і каму?), што Каляды — гэта найвялікшае свята, што дома мама, сям'я, што булкі…

На месяц мяне пазбаўляюць стыпендыі. А далей болей: на носе экзамен — па той самай хіміі. «Усё, — думаю, — не стаць мне настаўніцай, адлічаць». Дрыжу як асінавы ліст, але ж прадмет ведаю: адказваю на пытанні білета. Потым бяруся за лабараторную работу, за рэчывы. Выкладчыца з недаверам спыняе: расказвай, маўляў, што робіш, а то яшчэ ўзарвеш нас…

І праз імгненне:

— У Бога веруеш?

Слёзы з мяне проста градам:

— Не-е-е-а, — цягну…

Выскокваю ў калідор. Сяброўкі з усіх бакоў:

— Ну што? Ну як?

Тут жа разгарнулі залікоўку:

— Дык чаго ты равеш, дурніца? Тут жа «пяцёрка»!..

Дзякаваць Богу, здала я экзамен, паспяхова давучылася — стала настаўніцай. Але абразоў з хаты ніколі не выносіла, дзяцей (у мяне іх трое) хрысціла, а ў царкву і дагэтуль хаджу. Спадзяюся, што Бог, можа, даруе мне тое паўдзіцячае «Не-е-е-а».

**Аляксандра САРОКА.**
*в. Шашкі, Стаўбцоўскі раён.*

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЛЮБОЎ

На ўсіх скрыжаваннях можна пачуць пра тое, як мы, бацькі, выхоўваем дзяцей, а вось пра тое, як дзеці нас, — не…

Мы тады былі маладымі, толькі пераехалі ў новы дом — невялікі, трохпавярховы. А таму адразу ж з усіх жыльцоў сабралі якія-ніякія грошы, закупілі будаўнічыя матэрыялы — сталі даводзіць да ладу двор: талакой абгарадзілі яго, зрабілі прасторную альтанку; для малых (у кожнай сям'і па двое-трое дзетак было) паставілі пясочніцы, арэлі, бо трэба ж… А тым летам і нам, бо ў сям'і другое дзіцятка з'явілася — дачушка. Я, вядома ж, ля яе ўвесь час тапталася. А сыночак болей на вуліцы — то з дзецьмі, то з татам…

Дык вось. Выскокваю я неяк на балкон пялюшкі сушыць (пра памперсы нават чутак тады не было), следам мой хлопчык выходзіць і так сур'ёзна кажа: «Мама, а ты дзверы на балкон не зачыняй, хай яна замерзне». І на сястрычку паказвае.

